Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 ВЕРАСНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 186 (29808)

АЎТАРСКАЕ ПРАВА – НА ДЗІЦЯЧЫЯ ТАЛЕНТЫ 6

ВІШНЁВЫЯ КОСТАЧКІ ЗАМЕСТ ВУГАЛЮ 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына ДАЎГАЛА, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў:

«Фэйкі не наш шлях, зазначыў нядаўна Прэзідэнт. А тут важна, асабліва ў цяперашняй сітуацыі, каб было разуменне: інфармацыйная вайна — заўсёды маніпуляцыя масавай свядомасцю, а гэта кожны з нас паасобку і ўсе разам узятыя. Тысячы разоў сказана аб тым, як важна, ідучы да людзей, казаць праўду, а інакш навошта ісці? Якія б ні былі фэйкі, але праўда заўсёды перамагае».

ПРАФЕСІЯ — ПАШТАЛЬЁН

Фота БелТА.

Паштальён Віцебскага аддзялення паштовай сувязі нумар 1 Ганна ПАДАБЕДАВА стала пераможцай 25-га рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства работнікаў аб'ектаў паштовай сувязі, прысвечанага Сусветнаму дню пошты і Году гістарычнай памяці.

КАРАТКА

- **Міністэрства аховы здароўя: навучэнцы з ВРВІ могуць адсутнічаць на занятках без даведкі да пяці дзён.**
- Пасажырапаток праз беларускую граніцу з мінулага года вырас утрая.
- **У Беларусі расце спажыванне электраэнергіі для ацяплення і гарачага водазабеспячэння жылля.**
- БелАЗ правядзе дзень адкрытых дзвярэй 24 верасня.

- **У Беларусі ўвялі часовае рэгуляванне цэн на сродкі аховы раслін і кармавыя дабаўкі.**
- Курсанты МНС правядуць прафілактычную работу з насельніцтвам Стаўбцоўскага і Смалявіцкага раёнаў.

Па палічках

ЗАРПЛАТЫ, ВОДПУСК, «УДАЛЁНКА»

Якія змяненні прапануюцца ў Працоўны кодэкс?

Змяненні ў Працоўны кодэкс, якія будуць унесены ў выпадку прыняцця новага законапраекта, прадугледжваюць выдзяленне аплачваных дзён для праходжання дыспансерызацыі, грошы замест малака тым, хто працуе ў шкодных ці небяспечных умовах, магчымасць дзяліць водпуск больш чым на дзве часткі, а зарплату выплачваць не радзей, чым двойчы на месяц. Новы законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін» прадставіла ў Палаце прадстаўнікоў міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ, а дэпутаты прынялі яго ў аўтарскай рэдакцыі ў першым чытанні. Пры далейшай рабоце над законапраектам некаторыя нормы могуць змяніцца, аднак пакуль расказваем пра магчымыя новаўвядзенні.

Магчымасць камбінаваць дыстанцыйную работу з офіснай

Прапануецца шэраг навацый у частцы дыстанцыйнай работы. У цяперашні час Працоўны кодэкс дазваляе працаваць або на працоўным месцы, або дыстанцыйна, што мусіць быць адпаведным чынам адлюстравана ў працоўным дагаворы.

— Разам з тым побач з чыста дыстанцыйнай работай сёння становіцца запатрабаванай і такая форма працоўных адносін, якая дазваляе працаваць работніку ў асобныя дні тыдня на рабочым месцы, а ў іншыя — дыстанцыйна. Напрыклад, на працягу працоўнага тыдня чатыры дні ў офісе, адзін дзень — дыстанцыйна. Або частку працоўнага дня ў офісе, а частку — дыстанцыйна. Працоўны кодэкс не прадугледжвае магчымасці сумяшчаць формы работы. У сувязі з гэтым прапануецца дапоўніць яго нормамі, якія ўрэгулююць магчымасць чаргавання работы дыстанцыйна і на рабочым месцы, — адзначыла Ірына Касцевіч.

СТАР. 2

Наш агульны дом

АМБІЦЫЙНЫЯ ЗАДАЧЫ КАМУНАЛЬНІКАЎ

Планы ЖКГ да 2025 года і здабыткі выставы «Наш дом»

Дзяржпраграмай у краіне прадугледжаны штогадовы рамонт 2 % дамавых тэрыторый і капрамонт не менш як 3 % шматкватэрнага жылля. Неабходна таксама замяніць каля пяці тысяч ліфтаў. А дзяржаўная палітыка ў сферы выкарыстання адходаў мае на мэце да 2025 года забяспечыць выкарыстанне не менш як 64 % ствараемых цвёрдых камунальных адходаў. Гэтыя і іншыя амбіцыйныя задачы галіны ЖКГ немагчыма выканаць без інавацыйных тэхналогій і павышэння кампетэнцый персаналу, упэўненыя эксперты, якія расказалі пра задачы жыллёва-камунальнай сферы і спадзяванні ў дачыненні да першай Міжнароднай спецыялізаванай выставы жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Наш дом», якая праходзіць гэтымі днямі ў Мінску.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 — 763X

АДНОЎЛЕНАЯ СВЯТЫНЯ

У Гродне прайшлі ўрачыстасці з нагоды 30-годдзя Свята-Раства-Багародзіцкага жаночага манастыра

У святочных мерапрыемствах узяла ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля КАЧАНАВА. Пасля святочнай літургіі, якую ўзначаліў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, спікер верхняй палаты парламента звярнулася да вернікаў і падзякавала ігуменні Гаўрыіле (Глухавай) і насельніцам манастыра за працу па аднаўленні святыні.

Фота БелТА.

— Хачу падзякаваць вам яшчэ і таму, што вы займаецеся выхаваннем падрастаючага пакалення ў духу любові да ўсіх — да Бога, да свайго блізкага, да сваёй краіны. Вы робіце ўсё для таго, каб людзі разумелі і цанілі, як важна ўсё гэта захаваць, — дадала спікер.

Наталля Качанава выказала спадзяванні, што людзі і надалей будуць прыходзіць і прыязджаць сюды па падтрымку і суцяшэнне, па адказ на пытанне: што з'яўляецца самым галоўным у жыцці чалавека.

Манастыр мае даўнюю гісторыю. Ён размешчаны на месцы праваслаўнага сабора XII стагоддзя, рэшткі якога былі знойдзены падчас земляных работ у 80-я гады XX стагоддзя. У пачатку XVII стагоддзя храм быў перададзены ўніятам, пазней пры ім з'явіўся жаночы базыльянскі манастыр. Драўляны комплекс неаднаразова гарэў, і ў XVIII стагоддзі былі ўзведзены каменны храм і жылы корпус. У 1843 годзе манастыр стаў праваслаўным, быў асвечаны ў гонар Нараджэння Багародзіцы. Праз два дзесяцігоддзі пабудавалі цёплую манастырскую царкву ў гонар Сергія Раданежскага, а таксама гаспадарчыя карпусы.

За савецкім часам храм і манастыр некалькі дзесяцігоддзяў не дзейнічалі. Тут спачатку размяшчаліся спартыўныя клубы, затым комплекс перадалі Рэспубліканскаму музею атэізму і рэлігіі. У сценах былога манастыра праводзіліся выстаўкі і канцэрты. У 1992—1995 гадах будынкі вярнулі жаночаму манастыру. Указ аб перадачы ўсяго комплексу быў падпісаны Прэзідэнтам Беларусі, а пазней Аляксандр Лукашэнка і сам наведаў адноўленую святыню.

У 1992 годзе адбылося першае пасля закрыцця храма богаслужэнне, якое ўзначаліў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. Праз 10 гадоў манастыр атрымаў статус стаўрапігіяльнага і пераведзены пад непасрэднае кіраўніцтва Патрыяршага Экзарха.

Падчас святочных мерапрыемстваў 21 верасня на тэрыторыі манастыра адбыліся ўрачыстая цырымонія адкрыцця і асвячэнне бюста першаму Патрыяршаму Экзарху Беларусі Мітрапаліту Філарэту. Наталля Качанава ўручыла падзякі тым, хто садзейнічаў устанаўцы помніка, — Марыне Анікееай, генеральнаму дырэктару ААТ «Малочны мір», і Мікалаю Гаварко, дырэктару па развіцці ТАА «Белдан». Потым усе накіраваліся ў выставачную залу манастыра, дзе адкрылася экспазіцыя, прысвечаная памяці Мітрапаліта Філарэта.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ЗАРПЛАТЫ, ВОДПУСК, «УДАЛЁНКА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Такім чынам, прапануецца замацаваць, што дыстанцыйная работа можа быць пастаяннай, часовай ці камбінаванай. Часовая дыстанцыйная работа можа быць устаноўлена наймальнікам для работніка на пэўны тэрмін, які не павінен перавышаць шасці месяцаў у год. Работа будзе лічыцца камбінаванай пры выкананні яе з чаргаваннем дыстанцыйнай работы і работы па месцы знаходжання наймальніка. Пры гэтым для выканання дыстанцыйнай работы часова, на пэўны тэрмін, дастаткова загаду наймальніка. Умовы дыстанцыйнай работы могуць устанаўлівацца па дагаворы паміж наймальнікам і работнікам як пры прыёме на работу, так і пасля.

У Працоўны кодэкс прапануецца ўключыць нормы электроннай формы ўзаемадзеяння наймальніка і работніка. Гэтыя змяненні ў асобных выпадках дазволяць адмовіцца ад папяровага дакументаабароту. Напрыклад, пры азнаямленні работніка з лакальнымі прававымі актамі, са змяненнямі працоўных абавязкаў, з загадамі аб часовым пераводзе, выдзяленні працоўнага адпачынку, звальненні.

Аплачваны дзень для дыспансерызацыі

Важны блок новаўвядзенняў — дадатковыя сацыяльна-прававыя гарантыі, якія даюцца работнікам. У прыватнасці, прапануецца дапоўніць Працоўны кодэкс новым артыкулам, які ўстанаўлівае гарантыі работніку пры праходжанні дыспансерызацыі ў арганізацыях аховы здароўя. Работнікі будуць вызваляцца наймальнікамі ад работы з захаваннем сярэдняга заробку на пэўную колькасць дзён, якая абумоўлена ўзростам работніка.

Прапануецца ўстанавіць, што работнікі пры праходжанні дыспансерызацыі будуць вызваляцца ад работы на адзін дзень адзін раз на тры гады. Пры гэтым работнікі, якія дасягнулі ўзросту 40 гадоў і старэй, будуць вызваляцца ад работы на адзін дзень адзін раз на год. Работнікі, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, а таксама работнікі за пяць гадоў да дасягнення такога ўзросту будуць вызваляцца ад работы на два дні адзін раз на год. Гэта будзе магчымым на падставе пісьмовай заявы работніка ва ўзгодненыя з наймальнікам дні.

Прапануецца пашырыць і сацыяльна-працоўныя гарантыі бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей. Дадаецца норма, у адпаведнасці з якой дадатковы свабодны дзень у тыдзень, які даецца ў цяперашні час, можа быць заменены скарачэннем штодзённай працы на адну гадзіну. Такім чынам, бацькі, якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў ці траіх і больш дзяцей да 16 гадоў, могуць скарацiць працягласць штодзённай работы на адну гадзіну замест вызвалення ад работы на адзін дзень у тыдзень. Пра такія ўмовы работнікі мусяць дамаўляцца непасрэдна з наймальнікам, каб гэта права не перашкаджала дзейнасці арганізацыі.

Работнікі, якія рыхтуюць дысертацыі, атрымаюць права на аднаразовы водпуск з захаваннем заробку працягласцю не больш за 30 каляндарных дзён. Яго мэта — завяршэнне работы над дысертацыяй на саіскание вучонай ступені доктара навук.

Грошы замест малака

Яшчэ адной навацыяй у сацыяльна-працоўных гарантыях стане магчымасць па жаданні работніка, занятага на работах са шкоднымі ці небяспечнымі ўмовамі працы, замяніць выдачу малака ці паўнацэнных харчовых прадуктаў выплатай грашовай кампенсацыі. Гэта права з'явіцца ва ўсіх работнікаў, занятых на такіх работах, для гэтага таксама спатрэбіцца падача заявы. Памер кампенсацыі будзе ўстанаўлівацца ўрадам.

Для кампенсацыі наймальніку затрат на арганізацыю харчавання работніка прапануецца дадаць норму, якая дае права наймальніку ажыццяўляць утрыманне сумы з заработнай платы работнікаў, затрачаных на харчаванне, арганізаванае наймальнікам.

Заработная плата не радзей, чым двойчы ў месяц

Устанаўліваецца агульны падыход да пытання перыядычнасці выплаты заработнай платы работніку незалежна ад віду заключанага з ім працоўнага дагавора. Прапануецца рабіць выплату зарплаты не менш за два разы на месяц, у тым ліку работнікам, з якімі заключаны кантракты, а не мінімум адзін раз на месяц, як гэта вызначана цяпер.

Паўставачнікам можна адмовіцца ад перапынку на абед

Новы законапраект карэкціруе падыходы да ўрэгулявання асобных пытанняў па працоўным часе. У прыватнасці, удакладнены нормы Працоўнага кодэкса ў частцы працягласці рабочага часу ў рабочы дзень, які папярэднічае дзяржаўнаму святу для работнікаў, якія працуюць няпоўны рабочы час. Для такіх работнікаў працягласць работы ў перадсвяточны дзень будзе скарачацца прапарцыянальна іх няпоўнаму рабочаму часу. Іншымі словамі — калі штодзённая працягласць работы для работніка складае 4 гадзіны, то ў перадсвяточны дзень яго рабочы час скароціцца на 30 хвілін, а не гадзіну, як гэта ўстаноўлена для работнікаў, якія працуюць поўны рабочы дзень ці восем гадзін.

Зменяцца і нормы атрымання перапынкаў для адпачынку і харчавання. Усім работнікам на працягу працоўнага дня даецца перапынак для адпачынку і харчавання працягласцю не менш за 20 хвілін і не больш за дзве гадзіны, якія выкарыстоўваюцца паводле свайго меркавання і ў рабочы час не ўключаюцца. Прапануецца ўстанавіць, што перапынак для адпачынку і харчавання па жаданні работніка можа не выдзяляцца, калі працягласць яго работы не перавышае чатырох гадзін.

Будуць пашыраны магчымасці прыцягнення работніка да работы ў дзяржаўныя святы і святочныя дні. Прапанавана дазволіць прыцягваць работнікаў з іх згоды да работ, звязаных з правядзеннем масавых мерапрыемстваў.

Водпуск можна дзяліць больш чым на дзве часткі

З улікам правапрымяняльнай практыкі ўдасканальваюцца нормы, якія рэгулююць нормы выдзялення работнікам працоўных і сацыяльных водпускаў. Працягласць працоўнага водпуску пры дзяленні яго на часткі будзе вызначацца на дату атрымання кожнай з частак. Выплата сярэдняга заробку можа быць здзейснена са згоды работніка не пазней чым два рабочыя дні з дня пачатку працоўнага водпуску.

Работнік можа раздзяліць працоўны водпуск больш чым на дзве часткі не толькі ў тых выпадках, калі гэта прадугледжана калектыўным дагаворам, але і калі такое рашэнне будзе прынята наймальнікам. Пры гэтым як і цяпер адна з частак працоўнага водпуску мусіць быць не меншай за 14 каляндарных дзён.

Змяняюцца падыходы ў частцы выдачы водпуску па сямейна-бытавых прычынах. Цяпер указаны водпуск даецца працягласцю не больш за 30 каляндарных дзён за год без захавання заработнай платы. Іншая працягласць можа быць прадугледжана калектыўным дагаворам. Прапануецца ўстанавіць, што калектыўны дагавор ці наймальнік змогуць даць большую працягласць водпуску — да трох каляндарных месяцаў на працягу каляндарнага года. Дадзены сацыяльны водпуск даецца па такіх уважлівых сямейных прычынах, як нараджэнне дзіцяці, вяселле, смерць блізкага, догляд хворага блізкага сваяка. З улікам гэтага прапануецца замацаваць, што з захаваннем заработнай платы такі водпуск выдзяляецца на не больш чым тры каляндарныя дні па кожнай з указаных прычын.

Пры навучанні абавязаны даць водпуск

Скарэкціраваны нормы выдачы водпускаў у сувязі з навучаннем. У прыватнасці, прапануецца ўстанавіць абавязак наймальніка даваць такі водпуск без захавання заработнай платы работнікам, якія ўпершыню атрымліваюць сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю і работнікам, якія атрымліваюць прафесійна-тэхнічную адукацыю, без прывязкі да крытэрыю «ўпершыню». У цяперашні час наймальнік мае права адмовіць работніку, які навучаецца ва ўстановах адукацыі ў атрыманні нават неаплачванага водпуску, калі наймальнік у гэтым не зацікаўлены. Навучанне работнікаў па накіраванні наймальніка, як і раней, будзе ажыццяўляцца з захаваннем заробку за час навучання.

Устанаўліваецца таксама абавязак наймальніка даваць работніку водпуск без захавання заробку на час паступлення ва ўстанову адукацыі. Яго працягласць — да 12 каляндарных дзён без захавання зарплаты.

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнт Расіі падпісаў указ аб частковай мабілізацыі

Уладзімір Пуцін у спецыяльным відэазвароце заявіў, што падпісаў указ аб частковай мабілізацыі, паведаміла ТАСС. «Лічу неабходным падтрымаць прапанову Міністэрства абароны і Генеральнага штаба аб правядзенні ў РФ частковай мабілізацыі», — заявіў прэзідэнт Расіі. Мабілізацыйныя мерапрыемствы ў краіне пачаліся з 21 верасня. Уладзімір Пуцін даручыў кіраўнікам рэгіёнаў аказаць усё неабходнае садзейнічанне рабоце ваенных камісарыятаў. Паводле слоў прэзідэнта, у рамках аб'яўленай мабілізацыі прызыву на ваенную службу будуць падлягаць толькі ваеннаслужачыя запасу, перш за ўсё «тыя, хто праходзіў службу ў шэрагах узброеных сіл, мае пэўныя ваенна-ўліковыя спецыяльнасці і адпаведны вопыт». Мабілізаваныя грамадзяне Расіі будуць мець статус вайскоўцаў-кантрактнікаў.

Жыхары Балгарыі назвалі рост цэн і дэфіцыт газу самымі галоўнымі праблемамі



Сур'ёзны рост цэн і дэфіцыт прыроднага газу гэтай зімой з'яўляюцца галоўнымі праблемамі, якія хвалююць грамадзян Балгарыі. Пра гэта паведаміла мясцовая газета «Сега», спасылаючыся на вынікі даследавання Gallup International Balkan. Амаль 90 працэнтаў рэспандэнтаў лічыць рэальнай небяспекай размерны рост цэн. У гэтым грамадства практычна аднадушнае. Рызыка патэнцыяльнага недахопу прыроднага газу падаецца рэальнай для 80 працэнтаў балгараў. Амаль столькі ж апытаных апасаецца перманентнай палітычнай нестабільнасці ў краіне. Каля 70 працэнтаў думае, што ёсць верагоднасць дэфіцыту электраэнергіі. Таксама больш за 70 працэнтаў балгараў рыхтуецца да магчымай новай хвалі мігрантаў. Аднак дадзенае пытанне, як мяркуюць сацыёлагі, у апошнія гады стаіць не так востра, як праблемы з узроўнем жыцця.

АМБІЦЫЙНЫЯ ЗАДАЧЫ КАМУНАЛЬНІКАЎ

Сталіцу — на падземныя крыніцы

У рамках праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе на 2021—2025 гг.» камунальнікі краіны ўжо другі год працуюць над забеспячэннем якасці і даступнасці жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП), добраўпарадкаваннем населеных пунктаў, а таксама над захаваннем жыллёвага фонду і аднаўленнем яго тэхнічных і спажывецкіх якасцяў, расказаў **Віталь СМІРНОЎ, намеснік міністра МЖКГ:**

— Адна з першачарговых задач — забеспячэнне ўсіх беларусаў годнай пітной вадой, паколькі ў асобных населеных пунктах захоўваюцца праблемы з яе якасцю. Для забеспячэння беларусаў пітной вадой належнай якасці ў бягучым пяцігоддзі плануецца збудаваць каля 800 станцый абезжалезвання і каля 300 водазаборных свідравін. А для павышэння якасці ачысткі сцёкавых водаў і надзейнасці сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення — узвесці і рэканструяваць 70 ачышчальных збудаванняў. За пяцігоддзе плануецца таксама падключыць да існуючых сістэм цэнтралізаванага водазабеспячэння больш за сотню мястэчак і перавесці ўсіх сталічных спажыўцоў на ваду з падземных крыніц.

Уваход — бясплатны, але па рэгістрацыі

Ідэя стварэння прафесійнай выставы, якая датычыцца адразу ўсёй галіны жыллёва-камунальнай гаспадаркі, новая. Дагэтуль камунальнікі бралі ўдзел у пэўных выставах па розных кірунках работы галіны: вада, цяпло і г. д. Сёлета ж на тры дні на адной пляцоўцы выставачнага комплексу «БелЭкспа» збярэцца вядучыя айчынныя і замежныя эксперты і вытворцы. Сваю прадукцыю, паслугі і найноўшыя тэхналогіі ў сферы ЖКГ прадстаўляюць лідары вытворчасці абсталявання, спецтэхнікі, тэхналогій у рамках эксплуатацыі жылфонду, капрамонту, інжынерных сетак, ліфтавай гаспадаркі, аўтаматызацыі і праграмнага забеспячэння прылад уліку і кантролю.

— Падобнай прафесійнай дыялогавай пляцоўкі да гэтага часу не існавала, — падкрэсліў **Сяргей БАРАН, дырэктар «БелЭкспа».** *— Нам удалося падрыхтаваць насычаную дзелавую праграму і сфарміраваць цікавую экспазіцыю на трох тысячах квадратных метраў у павільёнах і больш як тысячы — на вуліцы. Падчас мерапрыемства можна скласці ўражанне пра стан і перспектывы галіны ЖКГ. Уваход на выставу бясплатны, аднак папярэдне трэба зарэгістравацца: загадзя на сайце выставы або непасрэдна пры ўваходзе на мерапрыемства. Узяць удзел у рабоце круглых сталоў можна, таксама зарэгістраваўшыся анлайн.*

Лічбавая трансфармацыя

Выстава мае на мэце не толькі паказ тэхналогій і напрацовак у сферы ЖКГ, але і насычаную дзелавую праграму па напрамках работы галіны. Укараненне перадавых тэхналогій, пытанні эксплуатацыі і тэхнічнага рэгулявання, падрыхтоўкі кадраў — усё гэта абмяркоўваецца на спецыялізаваных сустрэчах.

Так, у рамках круглага стала «Кіраванне агульнай маёмасцю сумеснага домаўладання. Канцэптуальныя падыходы да фарміравання сучаснай мадэлі кіравання» разгледзяць варыянты кіравання жыллём таварыствамі ўласнікаў і дзяржаўнымі органамі. Вынікам гэтай сустрэчы павінны стаць прапановы па далейшым развіцці кіравання жыллём як прафесійнай дзейнасці, абазначыў **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі МЖКГ:**

— На круглым стале «Лічбавая трансфармацыя працэсаў кіравання і эксплуатацыі жыллёвага фонду на аснове канцэпцыі лічбавых двайнікоў будынкаў і BIM-мадэлявання» абмяркуюць вектары развіцця сферы абслугоўвання жылля з прымяненнем IT-прадуктаў. Сёння ў галіне працуюць тэхналагічныя рашэнні ў падамавым уліку затрат, рабоце з заяўкамі ад насельніцтва і аварыйнымі сітуацыямі, а таксама іншых інфармацыйных працэсах.

Паколькі будаўнічая галіна гатовая праектаваць дамы з прымяненнем BIM-мадэлявання, неабходна забяспечваць і эксплуатацыю жылля з выкарыстаннем яго інфармацыйнай мадэлі, супастаўленне эксплуатацыйных затрат з жыццёвым цыклам будынка, дадаў эксперт.

Пітная якасць вады

Праблемы якасці пітной вады эксперты абмяркуюць на круглым стале «Забеспячэнне малых населеных пунктаў вадой нарматыўнай якасці. Праблемныя пытанні і шляхі іх вырашэння», расказала **Таццяна СЛІЖ, начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі МЖКГ:**

— Сёння ў Беларусі каля 1700 малых населеных пунктаў, дзе ёсць цэнтралізаваныя сістэмы водазабеспячэння, вада ў якіх не адпавядае нарматыўнай якасці па ўтрыманні жалеза. Для вырашэння праблемы будуюцца станцыі абезжалезвання вады, населеныя пункты перападключаюцца да існуючых цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння з вадой належнай якасці. А таксама прымяняюцца кампактныя ўстаноўкі і абсталяванне для абезжалезвання вады, устаноўка індывідуальных прылад.

Дзякуючы рабоце ў папярэднія гады камунальнікі забяспечылі больш за 400 тысяч чалавек пітной вадой належнай якасці. Было збудавана каля 670 станцый абезжалезвання і перападключана каля 50 населеных пунктаў. У мерапрыемстве возьмуць удзел таксама прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя і аблводаканалаў.

Яшчэ адзін круглы стол прысвечаны рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў з умовай абмежавальных мер. За 2021—2025 гады 28 з 70 запланаваных да рэканструкцыі ачышчальных збудаванняў планавалася зрабіць за кошт міжнародных арганізацый. Паколькі такое фінансаванне было прыпынена, на круглым стале эксперты абмяркуюць, за кошт якіх сродкаў можна будзе тое зрабіць. Да ўдзелу запрошаны таксама прадстаўнікі Мінпрыроды і расійскія калегі, якія раскажуць, як яны забяспечваюць свае малыя населеныя пункты вадой нарматыўнай якасці, удакладніла Таццяна Сліж.

Стратэгія абыходжання з адходамі

Азнаёміцца з перспектыўнымі тэхналогіямі ў сферы абыходжання з адходамі і абмеркаваць шляхі ўдасканалення дадзенай сферы эксперты змогуць на адпаведным круглым стале, акрэсліў **Арцём ШКРЫЛЬ, намеснік дырэктара дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»:**

— У рамках круглага стала плануецца абмеркаваць змяненні ў заканадаўстве і стратэгію па абыходжанні з ЦКА. Запрошаны прадстаўнікі расійскага экалагічнага аператара, якія раскажуць, як плануецца ўдасканальваць работу ў гэтай сферы ў Расіі. Тут жа будуць прысутнічаць прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў абедзвюх краін, прыватнага бізнесу і ЖКГ.

Асобны круглы стол будзе прысвечаны падрыхтоўцы кіраўнікоў, спецыялістаў і рабочых сістэмы ЖКГ, у якой сёння працуе каля 130 тысяч чалавек. Летась, дарэчы, у навучальных установах сістэмы прайшло навучанне каля 25 тысяч работнікаў галіны, падзялілася **Кацярына ГАРБАЧОВА, дырэктар дзяржаўнага цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў «Жылкам»:**

— Мы плануем абмеркаваць карпаратыўную падрыхтоўку спецыялістаў , якая вядзецца сёння не толькі ва ўстановах адукацыі, але і на месцах — у арганізацыях. Закрануць таксама пытанні па ўкараненні прафесійных стандартаў і сістэмы сертыфікацыі ў Беларусі. У 2023 годзе распачнецца пілотны праект па незалежнай сертыфікацыі спецыялістаў.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

❍ **Дарэчы**

100-працэнтны запас паліва

Сёлета падрыхтоўчая работа да асенне-зімовага перыяду арганізацыямі ЖКГ вядзецца на ўзроўні папярэдніх гадоў, расказала **Таццяна СЛІЖ, начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі МЖКГ:**

— Штотыднёва падрыхтоўка кантралюецца міністэрствам па 13 паказчыках: замена і капрамонт катлоў, цепласетак, стварэнне запасаў паліва, прафілактычны рамонт сістэм ацяплення і іншае. Штомесяц — па 89 паказчыках, сярод якіх, напрыклад, работы па выпрабаванні абсталявання кацельных цеплавых сетак, прафілактычны рамонт і агляд водаправодных і каналізацыйных сетак і збудаванняў. Усе гэтыя паказчыкі гарантуюць надзейнае, бесперабойнае і безаварыйнае цепла- і водазабеспячэнне жылога фонду, а таксама забяспечваюць функцыянаванне ўсёй інфраструктуры гарадскіх населеных пунктаў краіны.

На стане на 15 верасня на 100 % завершаны работы па выпрабаваннях і прафілактычным рамонце, праверка кацельных і цепласетак, прафрамонт ЦЦП (цэнтральных цеплавых пунктаў), ачыстка ўнутраных паверхняў катлоў і бойлераў. На 100 % на зіму назапашаны драўнянае паліва і паліўны мазут.

Перавыкананы план па перакладцы сетак водазабеспячэння і водаадвядзення: 278 кіламетраў водаправоду і 110 кіламетраў каналізацыі. Заменена 361,2 км (87 %) цепласетак. Пашпарты гатоўнасці атрымалі 3403 цеплакрыніцы (99,6 %) галіны ЖКГ і 90 пашпартоў гатоўнасці (каля 91 %) — іншых ведамстваў.

— Завершаны таксама работы па падрыхтоўцы жылфонду па наступных напрамках: прафілактычны рамонт сістэм ацяплення цеплапунктаў, рамонт стыкаў панэляў і дахаў. А для ўстаранення магчымых аварыйных сітуацый сфарміравана 719 аварыйна-аднаўленчых брыгад колькасцю больш за тры тысячы чалавек, — удакладніла спецыяліст. — Напагатове 15 перасовачных модульных кацельных, 597 аўтаматычных перасовачных крыніц электразабеспячэння, праведзена 14 трэніровак па іх разгортванні.

Снегаўборачная тэхніка ў краіне гатовая да работы на 97 %. Пясчана-саляной сумесі для апрацоўкі дарожна-вулічнай сеткі Беларусі назапашана 40 %.

Па сутнасці

ПРА ГАЛОЎНАЕ

Ёсць прамовы, што ўвайшлі ў сусветную гісторыю, сталі ўзорамі аратарскага майстэрства. А ёсць тыя, якія найперш кранулі чалавечыя сэрцы. Не ведаю, як у будучыні назавуць на старонках падручніка па гісторыі беларускай дзяржаўнасці зварот нашага Прэзідэнта 17 верасня 2022-га. Восеньскай прамовай, Верасняўскай альбо Прамовай яднання. Пакажа час. Але тое, што яна насамрэч гістарычная, — дакладна.

Гэта адчуванне адзінства і паразумення — усё пройдзем, усё вытрымаем. Калі разам. Так хораша, калі разам уся Беларусь! Не шукайце шчасця і праўды на чужыне. Не атрымаецца. Не знойдзеце ні сэнсу, ні сябе. Лягчэй знайсці папараць-кветку ў родным лесе. Паглядзіце ў вочы тых, хто з'ехаў, збег, — збянтэжанасць і пустэча. І ніякія карцінкі шыкоўнага ўрбанізму не закрыюць тую бездань.

Калі галоўныя медыя мяцежнай прапаганды хорам, як па камандзе, пачалі дзяўбці вызваленчы паход Чырвонай Арміі на захад Беларусі, тое, мабыць, стала момантам ісціны нават для самых ашалелых і неверагодных аматараў еўрацэнтрызму. Стала зразумела, на каго працуе нібыта беларуская апазіцыя. Ну калі вы і цяпер супраць 17 Верасня — то вы не беларусы. Нават і без карткі паляка — не беларусы. Куды вы зліваліся нашу краіну? З марамі аб міфічным мінулым — у мінулае і зліваліся. Пад бізун паньства з Кракава і абцасы асаднікаў з Варшавы.

Некалькі пытанняў. Дзе беларускія навукоўцы з часоў панавання над намі Польшчы? Польшчы інтэлігентнай і адукаванай.... А пры «быдлаватых» Саветах з хат з саламянымі стрэхамі і земляной падлогай да нябесаў дабраліся Клімук і Кавалёнак. І да вяршынь сусветнай дыпламатыі — Грамыка. Няўжо халопам так хораша жылося «за польскім часам», што нават дзверы замест замкоў перавязвалі каўбасамі? Пра той час шмат фэйкаў напладзілі. І пра жыццё пры Пілсудскім, і пра народны дух барацьбы Каліноўскага. Што мы ўкладвалі ў галовы нашых дзяцей? Павагу да «праклятых» салдат ці да паноў, што нарадзілісія на нашых землях і зневажалі іх, сапраўдных жыхароў?

А памятаеце, як нас з 1990-х разам з пафабарванай вяндлінай з Беластока насычалі нянавісцю да гэтага вызвалення? Убівалі ў мазгі, што камуністы — тое ж, што і нацысты. Але ёсць жа гістарычная рэчаіснасць. Па-першае, мы — беларусы — аказаліся разам. Нарэшце. Па-другое, менавіта Пілсудскі з Гітлерам хадзілі побач, абдымаліся... А ў Варшаве, якую ад знішчэння нацыстамі выратавалі былыя халопы, у канцы 1930-х намагаліся паставіць помнік Гітлеру. Дарэчы, трапна, лепш не скажаш, адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Мы іх вызвалілі, а яны нам адказалі — байполамі, байсоламі і белсатамі. «Змагары»... Чаму вы ніколі не расказвалі пра 600 тысяч загінулых савецкіх салдат падчас вызвалення Варшавы? Асабісты боль. З 18 хлапцоў, прызваных з вёскі майго дзядулі, пасля штурму Варшавы засталося толькі двое... Дуда і Маравецкі, вы штосьці пра рэпарацыі. Лепш маўчыце. Мінута маўчання. Па тых, дзякуючы каму вы дыхаеце паветрам.

І апошнее, калі не першае, пра Польшчу. Нацыянальныя «героі» — палітычны істэблішмент Варшавы — збеглі ад вайны ў Лондан. Паны аказаліся падпанкамі. Лакеямі лордаў. А сёння што змянілася? Хіба на кансультацыі не трэба ездзіць — зум-канферэнцый даволі...

Так, мы можам і нават павінны ганарыцца перамогамі сівой мінуўшчыны, велічнымі замкамі і палацамі, тэатрамі Радзівілаў, паясамі слуцкіх мануфактур. Але павінны памятаць Гусляра і Бандароўну — яны, хай сабе і літаратурныя героі, таксама з нашай, нявыдуманай, гісторыі. І сёння нам усім — і камбайнерам, і айцішнікам — неабходнае гэтае ўпэўненае веданне і разуменне: пасля 17 верасня 1939 года адбылося яднанне дзяржавы, народа, людзей, сем'яў. А яшчэ колішнія халопы адчулі сябе людзьмі. Без гэтага пачуцця годнасці нас не было б. І сёння мы не пад харунжымі, не пад панамі, не пад алігархамі. Мы самі. І разам.

Дзесьці недалека ад трасы, што злучае два заходнія пункты адзінай Беларусі «Высокае — Слонім», стаіць помнік загінулым падчас вайны 1812 года. Дык вось, на тым помніку напісана, што тут ляжаць нашы продкі, якія змагаліся па розныя бакі. Затое ляжаць разам — зямелька аб'яднала. Дык давайце ж разам будзем не ў сваёй зямлі, а на ёй.

Яўген ПУСТАВОЙ.

Информация о проведении повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 80 % после вторых несостоявшихся торгов по продаже имущества, принадлежащего Республиканскому унитарному предприятию «Производственное объединение «Белоруснефть» на праве хозяйственного ведения
Дата проведения аукциона: 20 октября 2022 г. в 10.00. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 1.1

Лот № 1	Система сварочная наружная однодуговая компьютеризированная Veraweld Torch System S 410031935091. **Начальная цена: 121 568,58 рубля** (в т. ч. НДС 20 %). **Задаток: 12 156,86 рубля** (в т. ч. НДС 20 %)	Компьютеризированный сварочный автомат для автоматической, автоматической импульсной сварки проволоки сплошного сечения в среде защитных газов (MIG/MAG/GMAW), самозащитной порошковой проволокой (FCAW), углеродистых легированных, высоколегированных нержавеющих сталей и цветных металлов, а также аргонодуговой сварки (GTAW) и ручной дуговой сварки покрытыми электродами (SMAW). Диаметр свариваемых труб от 159 мм и выше. Организация-изготовитель VERMAAT TECHNICS. Голландия, год изготовления 2020. Местонахождение: Республика Беларусь, Гомельская обл., Речицкий р-н, Пересятовский с/с, 6. Самовывоз со склада продавца
Лот № 2	Стеллаж 1 секционный для хранения кабельной продукции (инв. № 100000016048) **Начальная цена: 1 391,34 рубля** (в т. ч. НДС 20 %). **Задаток: 139,13 рубля** (в т. ч. НДС 20 %)	Стеллаж для хранения катушек диаметром 1000, 1200, 1400 мм кабельной продукции на открытой ж/б подкрановой площадке. Максимальная суммарная нагрузка на пролет 3500 кг. Габаритные размеры стеллажа: Д*Ш*В – 8675*4070*2300 мм. Конструкция неразборная, снабжена переходной площадкой с ограждением высотой 1200 мм, масса стеллажа не более 2675 кг. Местонахождение: Республика Беларусь, Гомельская обл., Речицкий р-н, Пересятовский с/с, 15/3. Самовывоз со склада продавца
Лот № 3	Стеллаж 1 секционный для хранения кабельной продукции (инв. № 100000016049) **Начальная цена: 1 391,34 рубля** (в т. ч. НДС 20 %). **Задаток: 139,13 рубля** (в т. ч. НДС 20 %)	
Лот № 4	Стеллаж 1 секционный для хранения кабельной продукции (инв. № 100000016050) **Начальная цена: 1 391,34 рубля** (в т. ч. НДС 20 %). **Задаток: 139,13 рубля** (в т. ч. НДС 20 %)	
Лот № 5	Стеллаж 1 секционный для хранения кабельной продукции (инв. № 100000016051) **Начальная цена: 1 391,34 рубля** (в т. ч. НДС 20 %). **Задаток: 139,13 рубля** (в т. ч. НДС 20 %)	
Лот № 6	Стеллаж 1 секционный для хранения кабельной продукции (инв. № 91300001510) **Начальная цена: 1 363,28 рубля** (в т. ч. НДС 20 %). **Задаток: 136,33 рубля** (в т. ч. НДС 20 %)	
Лот № 7	**Котел водогрейный КВ-0,12** с комплектом автоматики. **Начальная цена: 2 049,27 рубля** (в т. ч. НДС 20 %). **Задаток: 204,93 рубля** (в т. ч. НДС 20 %)	Характеристика имущества: котел водогрейный, стальной, жаротрубный, рабочее давление 0,6 Мпа. Предназначен для нагрева воды давлением, используемой в системах отопления, и в качестве промежуточного теплоносителя для горячего водоснабжения жилых, производственных и административных зданий, производства ОАО «ГСКБ», год изготовления 2012. Местонахождение: Республика Беларусь, Гомельская обл., г. Речица, ул. Коммунальный проезд, 10. База общепита – УСО РУП «Производственное объединение «Белоруснефть». Самовывоз со склада продавца
Лот № 8	**Котел водогрейный КВ-0,12** с комплектом автоматики. **Начальная цена: 2 049,27 рубля** (в т. ч. НДС 20 %). **Задаток: 204,93 рубля** (в т. ч. НДС 20 %)	

Организатор торгов: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95, сайт: www.ino.by, e-mail: gomel@ino.by, auction-gino@gino.by

Извещение о проведении аукциона опубликовано 21.09.2022 г. на официальном сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by со ссылкой на сайт Организатора торгов ino.by

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Предмет торгов – Лот: 1) капитальное строение с инвентарным номером 141/С-14776 (наименование: здание свинарника; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 327,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Степанковский с/с, 5, 0,1 км южнее д. Полевая Речица, на земельном участке с кадастровым номером 122583000002000036, площадью 1,3112 га;
2) капитальное строение с инвентарным номером 141/С-14777 (наименование: здание телятника; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 643,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Степанковский с/с, 5/1, 0,1 км южнее д. Полевая Речица, на земельном участке с кадастровым номером 122583000002000036, площадью 1,3112 га, составные части и принадлежности: артезианская скважина

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	30 720,00	**Размер задатка, руб.**	3 072,00

Продавец: ОАО «Орепичи», Брестская обл., Жабинковский р-н, д. Орепичи, ул. Тимофея Лося, 9, тел./ф. 801641 68 0 34. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 80162 40 87 01. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 12 октября 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, и иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 11 октября 2022 г. до 17.00

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Калинковичский завод бытовой химии» (продавец) извещает о проведении 25 октября 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условия продажи: Инженерные сети (электрические, водопроводные, канализационные), проходящие внутри границ приобретенного участка, являются собственностью ОАО «Калинковичский завод бытовой химии». Их дальнейшее совместное использование, ремонт (включая капитальный) модернизацию, замену, демонтаж, реконструкцию, подсоединение вновь разводимых к существующим новый собственник осуществляет за свой счет по согласованию с ОАО «Калинковичский завод бытовой химии» (или его преемником). Не позднее 2 (двух)-месячного срока со дня подписания договора купли-продажи новый собственник обязан установить ограждение по границам приобретенного земельного участка		
1	**Капитальное строение с инв. № 333/С-21735** общей площадью **591,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад сырья**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В. **Капитальное строение с инв. № 333/С-21725** общей площадью **717,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание склада с навесом для хранения котельного топлива**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В/1. **Капитальное строение с инв. № 333/С-21740** общей площадью **18,5 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание туалета**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В/1. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **322350100003006201** общей площадью **0,5760 га (право аренды). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания склада сырья	**230 177,63**	23 017,76
2	**Капитальное строение с инв. № 333/С-21739** общей площадью **53,8 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание комнаты отдыха**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17Г. **Капитальное строение с инв. № 333/С-21737** общей площадью **37,8 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание овощехранилища**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17Г/1. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **322350100003006200** общей площадью **0,4676 га (право аренды). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17Г. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания здания комнаты отдыха	**13 440,00**	1 344,00

Продавец: ОАО «Калинковичский завод бытовой химии», 247710, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17. **Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел.: **8 (033) 616-72-16 Чернявский Эдуард Петрович;** заключение договора купли-продажи по **тел.: 8 (029) 532-70-87 – Логвина Аксана Ивановна.**

Шаг аукционных торгов по лоту № 1 – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона, по лоту № 2 – 15 % (пятнадцать) % от начальной цены предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (ОАО «Калинковичский завод бытовой химии»):** р/с BY70 BLBB 3012 0400 0230 8000 1001, БИК BLBBBY2X, в ЦБУ № 307 ОАО «Белинвестбанк» г. Калинковичи, УНП 400023080, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1, по лоту № 2 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 22 сентября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 октября 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения.

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Для лота № 1 предоставляется рассрочка платежа в соответствии с действующим законодательством РБ. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 420/С-37362 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание пункта технического обслуживания – 3), общей площадью 130,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, 200В, корп. 1 с составными частями и принадлежностями (пристройка (Б1/к));
- капитальное строение, инв. № 420/С-39604 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин непродовольственных товаров), общей площадью 28,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, пр-т Победы, 200В, с составными частями и принадлежностями (пристройка (Б1/к), покрытие (а), сооружение благоустройства (б), водопроводная сеть (в), тепловая сеть (трубопровод подающий, трубопровод обратный) (г), канализационная сеть (д), линия наружного освещения (е), резервуары РГС с технологическими трубопроводами (ж), линия связи (и));
- оборудование: водомер СВХ-20; водогрейный котел на жидком топливе Vaillant VKO 27; бойлер Vaillant 120L; счетчики трехфазные (3 шт.); средства охранно-пожарной сигнализации (2 шт.); система охранной сигнализации; пожарная сигнализация; пожарно-питьевой водопровод наружный; мини-павильон 6*6.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000012000056, площадью 0,7354 га (назначение – для обслуживания магазина непродовольственных товаров), находящемся по адресу: г. Лида, пр-т Победы, 200В.
Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Обременения со стороны третьих лиц нет

Начальная цена продажи – 320 990,40 руб. (триста двадцать тысяч девятьсот девяносто рублей сорок копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 32 099 руб. (тридцать две тысячи девяносто девять рублей)

Продавец – Открытое акционерное общество «Лиданефтепродукт», 231300, г. Лида, пр-т Победы, 127, тел. 8-0154-522-606

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 05 октября 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.07.2022 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 03 октября 2022 г. до 15.00

Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/

Извещение о проведении торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона	**ОАО «Агат-электромеханический завод» 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 115, каб. 317**
Продавец	**ОАО «Агат-электромеханический завод», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 115, каб. 317**

Предмет аукциона
Оборудование, бывшее в употреблении, по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 115 (территория предприятия)

Лот №	Наименование	Год выпуска	Инвентарный номер	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	Настольно-сверлильный станок 2М112	1972	42306246	503,04
2	Радиально-сверлильный станок 255	1953	42306068	1775,04
3	Универсально-фрезерный станок 676П	1972	42308063	1775,04

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона**

Условия оплаты предмета торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель торгов либо единственный участник торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в торгах

Аукцион проводится без задатка. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое подписывается перед началом аукциона. Информация и фотографии лотов приведены на сайте https://agat-emz.by/pokupatelyu/spetspredlozheniya/

Организатор торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и торгов	**10.10.2022 г.** с 14.00. Торги проводятся в очном формате на территории ОАО «Агат-электромеханический завод». Присутствие Покупателя обязательно
Дата и время окончания приема заявок	Заявка в произвольной форме на имя первого заместителя директора – главного инженера с указанием наименования лота. По 10.09.2022 до 16.40. В рабочие дни с 8.00 до 12.20, с 13.00 до 16.40 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 115а, каб. № 317 (канцелярия) либо на электронную почту info@agat-emz.by
Контактные данные	**Тел.: +375 17 377-60-80, info@agat-emz.by**

Сямейная газета
Выпуск № 15 (197)

РАКА З... МАЛАКА

Аднойчы пайшла я разам з сябрамі забіраць хрэсніцу з садка. Якраз у гэты час дзеткі завяршалі вячэру. Праз адчыненыя дзверы хлопчык прыкмеціў сваю маму. І так узрадаваўся, што кінуўся да дзвярэй з кубкам, у якім было недапітае малако. На падлозе ўтварылася сапраўдная малочная рака. Пакуль малы плакаў (ніхто на яго не крычаў, відаць, на яго сварацца за правіннасці дома?), а выхавальніца пабегла па анучу, каб выцерці падлогу... Дзве дзяўчынкі, па якіх яшчэ не прыйшлі бацькі, не гублялі дарэмна час: яны пачалі пераскокваць праз белы ручаёк і радасна смяяцца. У той момант я чарговы раз падумала, што нам, дарослым, ёсць чаму павучыцца ў дзяцей. Напрыклад, лёгкасці, экспромту і здольнасці адкрыта праяўляць свае эмоцыі. А яшчэ любы мінус імгненна ператвараць у плюс.

Вось і мой Сымон днямі прыемна здзівіў сваімі развагамі. Па дарозе ў садок запытаўся: «Мама, а калі я вярнуся, бабуля яшчэ будзе?» — «Не, — кажу са спачуваннем у голасе, — паедзе дахаты, ёй жа на працу трэба». Ну, думаю, зараз, пачне румзаць. Аж не: без месяца чатырохгадовы філосаф уважліва паглядзеў мне ў вочы і рэзюмаваў: «Ведаеш, мама, я радуюся, калі бабуля ў нас у гасцях. І калі яе няма — таксама радуюся. І вось зараз іду ў садок і радуюся. А калі ўдаруся, дык паплачу крыху і зноў буду радавацца».

Пасля гэтых слоў я згадала сваю любімую кнігу пра «Паляну». Гераіня Элінар Портэр засталася без бацькоў. Яе жыццё ў маленькім пакойчыку на гарышчы ў строгай цёткі-апякункі нельга назваць радасным. Але дзяўчынка валодае сапраўдным чараўніцтвам — яна ўмее гуляць у «радасць». Правілы гэтай гульні вельмі простыя. Трэба проста старацца знаходзіць штосьці радаснае нават у самых сумных рэчах. Вось крыху падрасце Сымонка — абавязкова дам яму пачытаць гэтую аповесць. Думаю, яму спадабаецца.

Сын маёй сяброўкі таксама той яшчэ філосаф. Штораз раніцай, пакідаючы Даню ў садку, Таня ляцела хутчэй на вуліцу, каб памахаць яму ў акно і паслаць паветраны пацалунак, інакш слёзы-істэрыка. А тут на днях малы выдаў: «Мама, я табе махаць не буду. Ты не смуткуй, галоўнае — што ты ў мяне ў сэрцы». Ці вось яшчэ: неяк прыйшоў Даніла з садка і кажа: «Мама, а чаму Кузьмінічна (выхавальніца) так засмучаецца, калі мы робім памылкі?! Мы ж проста вучымся!» Ну праўда ж міла?

«Дзіця можа навучыць дарослага тром рэчам: радавацца без прычыны, заўсёды знаходзіць сабе занятак і настойваць на сваім», — пісаў Паўла Каэльа. Акрамя таго, побач з імі мы, мамы і таты, можам без машыны часу адчуць сябе дзецьмі.

Улетку я адправіла сяброў на сустрэчу, а сама тым часам засталася нянчыць іх трохгадовую дачку. За тыя паўтары гадзінкі мы паспелі наляпіць марозіва з пяску, намаляваць крэйдачкамі на асфальце казачную краіну, а яшчэ я паказала Івонцы, як гуляць у класікі. Менавіта за гэтым заняткам мяне і застаў незнаёмец, які праходзіў міма. Ён спыніўся і з добразычлівай усмешкай сказаў: «Як я вас разумею! Толькі з дзецьмі можна без аглядкі выйсці ў двор і паскакаць на адной ножцы. Мне таксама ўзімку так захацелася пакатацца з горкі. Узяў з сабой сына ды дачку і адарваўся па поўнай. Апошні раз я так пішчаў ад захаплення, яшчэ калі сам вучыўся ў школе. Калі б паехаў катацца адзін — людзі падумалі б, што ў мяне з галавой не ўсё ў парадку. А так яны ўсміхаліся і думалі, як дзецям пашанцавала з татам. А адзін хлопчык, якога на горку прывяла бабуля (і чакала яго на лавачцы), падышоў і сказаў: «Якая ў вас класная сям'я!».»

Здаецца, нічога асаблівага той мужчына не сказаў. А на душы ад яго слоў — і дагэтуль прыемны паслясмак. Дарэчы, менавіта пасля той сустрэчы на маёй лядоўні з'явіўся новы надпіс: «Калі хочаце вырасціць добрых дзяцей, выдаткоўвайце на іх у два разы менш грошай і ў два разы больш часу». Веру, што калі хоць на выхадных так весела бавіць час усёй сям'ёй, то свет будзе дабрэйшы і больш радасны.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Тыя, хто побач

Службовы раман Станіслава Вількіна,

або Гісторыя кахання з вялікай літары

Хто ведае, як нараджаецца каханне? Чаму жыццё адных праходзіць міма гэтых пачуццяў, а іншых яны літаральна пераследуюць? Чаму ў кагосьці выпрабаванні хутка гасяць закаханасць, а ў кагосьці наадварот? Здаецца, усе гісторыі адносін мужчын і жанчын вельмі падобныя, але кожным уласны сюжэт успрымаецца як адзіны і непаўторны. Як гісторыя кахання з вялікай літары.

(Заканчэнне на 7-й стар. «СГ».)

У сезон

«Віта» значыць «жыццё»

Баіцеся надыходу сезона грыпу і коўіду? Запасайцеся вітамінамі на зіму!

У Беларусі стартавалі традыцыйныя восеньскія сельскагаспадарчыя кірмашы. Да самага снежня там будуць прадаваць свежыя «вітаміны», якія выраслі ў палях, гародах і лясах гэтым летам. А таксама мяса, сала, яйкі і іншыя прадукты ад фермераў і сельгаспрадпрыемстваў ды мёд ад пчаляроў. Агульнавядома, што вітаміны неабходныя ўсім і кожнаму, і асабліва — напярэдадні зімы. Але дзе іх шукаць? Пра гэта гутарым са спецыялістам па здаровым харчаванні.

— Да найважнейшых парушэнняў харчовага статусу насельніцтва Рэспублікі Беларусь належаць залішняе спажыванне жывёльных тлушчаў; дэфіцыт поліненасычаных тлустых кіслот; паўнавартасных жывёльных бялкоў; харчовых валокнаў і мінеральных рэчываў. А таксама — дэфіцыт вітамінаў, — адзначае **намеснік генеральнага дырэктара па стандартызацыі і якасці прадуктаў харчавання РУП «Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні», кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Алена МАРГУНОВА.**

— Вітаміны — гэта складаныя біялагічна актыўныя рэчывы. Яны бяруць удзел ва ўсіх жыццёвых працэсах. І пры гэтым некаторыя з іх не ўтвараюцца ў арганізме чалавека або ўтвараюцца ў недастатковай колькасці.

Таму так важна ўключаць у рацыён прадукты, якія змяшчаюць вітаміны, адзначае спецыяліст.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Ведай нашых!

А ў падарунак — тэлевізары

Найлепшыя працоўныя дынастыі МТЗ, БМЗ і БелАЗ

У Мінску прайшоў рэспубліканскі конкурс працоўных дынастый. За званне «Найлепшая працоўная дынастыя — 2022» на сцэне Палаца культуры Мінскага трактарнага завода змагаліся 11 сем'яў з розных прамысловых прадпрыемстваў Беларусі.

Фотакалажы, творчыя нумары, віктарыны... Кожная дынастыя дэманстравала на сцэне відэапрэзентацыю, а таксама прадстаўляла сябе ў вольнай форме. Сярод выпрабаванняў, за якія сем'і атрымлівалі балы, — квіз, які складаўся з пытанняў, прысвечаных Году гістарычнай памяці і гісторыі роднага завода.

Ініцыятарам конкурсу ўжо другі год запар выступае аб'яднаная арганізацыя прадпрыемстваў Міністэрства прамысловасці ГА «Беларускі саюз жанчын».

— Сёлета мы атрымалі шмат заявак з усіх рэгіёнаў Беларусі, — адзначыла **Наталля МЕДЗВЯДЗІЦКАВА, намеснік старшыні ГА «БСЖ» Міністэрства прамысловасці.** — Для ўдзелу ў фінале адабралі па адной дынастыі з кожнага холдынга. Сярэдні працоўны стаж такіх дынастый на адным прадпрыемстве — каля 170 гадоў!

Паводле слоў **старшыні галіновага прафсаюза «БЕЛПРАФМАШ» Валерыя КУРСЕВІЧА**, утварэнне працоўных дынастый — добры паказчык стабільнасці прадпрыемства, дзе вопыт і навыкі перадаюцца з пакалення ў пакаленне, ад бацькоў да дзяцей. Бо працоўная пераемнасць з'яўляецца ў тых сем'ях, у якіх старэйшыя пакаленні любяць сваю прафесію, прадпрыемства, дзе займаюцца сваёй справай з задавальненнем і адданасцю. Сям'я — самае блізкае і дарагое асяроддзе чалавека. Калі гэта не проста сям'я, а працоўная дынастыя, дзе прадстаўнікі некалькіх пакаленняў выбралі адно і тое ж месца працы — гэта ўжо сапраўдная сямейная традыцыя.

Першае месца па выніках конкурсу заняла працоўная дынастыя Мінскага трактарнага завода Рабашэнка-Чумак, сукупны агульны стаж работы на прадпрыемстве якой 251 год. На другім — сям'я Філановіч-Літаш, якая прадстаўляла Беларускі металургічны завод. Трэцяе месца атрымала дынастыя Міхейчыкаў з Беларускага аўтамабільнага завода. Пры вызначэнні пераможцаў ацэньваліся прэзентацыі сваёй сям'і і прадпрыемства і, вядома ж, значнасць іх працоўнага ўкладу ў поспехі роднага завода.

Усе ўдзельнікі конкурсу атрымалі вымпелы, грашовыя сертыфікаты і торты. Пераможцы ж запрошаны на святочны канцэрт, прысвечаны прафесійнаму свяце — Дню машынабудаўніка, які адбудзецца 23 верасня ў Палацы культуры «Гомсельмаш». Менавіта там ім ва ўрачыстай атмасферы ўручаць каштоўныя падарункі — тэлевізары.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Інтэлектуальная ўласнасць

АЎТАРСКАЕ ПРАВА НА ДЗІЦЯЧЫЯ ТАЛЕНТЫ — фінансавыя выгоды для малога і інвестыцыі ў дабрабыт грамадства

Чаму важна фарміраваць у дзяцей разуменне аўтарскага права на створаныя імі вырабы і творы? Якія перавагі даюць малым іх таленты і здольнасці? Ці могуць распараджацца сваімі правамі на інтэлектуальную ўласнасць дзеці і падлеткі? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні далі эксперты Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці.

Здабыткі маральныя і матэрыяльныя

Паўсюдна падкрэсліваецца, што вельмі важна развіваць у дзяцей фінансавую, прававую, юрыдычную свядомасць. Адак не менш важна фарміраваць у малых свядомасць і ў сферы інтэлектуальнай уласнасці. І дарослыя таксама павінны ведаць, што такое правы дзяцей як аўтараў і ўладальнікаў інтэлектуальнай уласнасці. Такім чынам мы інвестуем у будучыню, у дабрабыт грамадства і дзяржавы, падкрэсліў **Аляксандр ЗАЯЦ, намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці (НЦІУ):**

— Нашы дзеці штодня ствараюць інтэлектуальную ўласнасць. Нехта піша вершы, нехта малюе, нехта распрацоўвае камп'ютарныя праграмы, а нехта ў юным узросце ўжо з'яўляецца прафесійным выканаўцам. Кожнае дзіця — творца, і важна адшукаць і раскрыць яго таленты і здольнасці. А яшчэ мы павінны растлумачыць дзецям, што яны могуць свабёй працай і розумам абагачацца не толькі маральна і духоўна, але і мець матэрыяльныя выгоды ад сваіх здольнасцяў, талентаў і магчымасцяў. То-бок дзеці павінны разумець, што такое інтэлектуальная ўласнасць і якія перавагі яна можа ім прынесці

З іншага боку, з дзяцінства малыя павінны ведаць, што нельга браць чужое — «не бяры цацкі, не спытаўшы ў іх гаспадара». Тое ж датычыцца і інтэлектуальнай уласнасці: нельга прысвойваць вершы або малюнкі суседа па парце або выкарыстоўваць пірацкую музыку.

Задача дарослых — тлумачыць дзецям з маленства, што, каб выдзяліцца ў асяроддзі аднагодкаў, неабавязкова мець тэлефон апошняй мадэлі. Можна напісаць верш, які пакладуць на музыку, і кампазіцыя стане вядомым хітом. Можна стварыць мабільны дадатак, які будзе мець сотні тысяч пампаванняў. Можна прыдумаць нейкую тэхнічную прыладу, якая стане асновай будучага стартапу. Можна прыводзіць шмат прыкладаў, каб дзеці разумелі, што інтэлектуальная ўласнасць — гэта іх магчымасці і перавагі. Такім чынам, гэтая асветніцкая работа з малымі стане інвестыцыяй у будучыню грамадства і дзяржавы, падкрэсліў спецыяліст.

Аўтарскае права да 14 гадоў і пасля

Класічна інтэлектуальная ўласнасць падзяляецца на дзве групы аб'ектаў: аб'екты аўтарскага права і сумежных правоў, а таксама аб'екты права прамысловай уласнасці. Да першай групы адносяцца літаратурныя, музычныя, мастацкія творы, камп'ютарныя праграмы і іншае. Да другой — вынаходніцтвы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, тапалогія інтэгральных мікрасхем, сарты раслін, сакрэты вытворчасці ноу-хау і іншае, агучыла **Марыя ШМАТАВА, вядучы спецыяліст аддзела права прамысловай уласнасці і дагавораў упраўлення прававога і кадравага забеспячэння НЦІУ:**

— У дачыненні да ўсіх гэтых аб'ектаў у аўтараў і іншых праваўладальнікаў узнікаюць пэўныя правы: асабістыя немаёмасныя правы і маёмасныя. Бадай, самае вядомае асабістае немаёмаснае права, якое ўзнікае абсалютна ва ўсіх аўтараў, — права аўтарства, то-бок права прызнавацца аўтарам. У дачыненні маёмасных правоў найбольш важнае — выключнае права. Яно дае аўтару і праваўладальніку магчымасць распараджацца і выкарыстоўваць канкрэтны аб'ект інтэлектуальнай уласнасці самастойна ці дазваляць (або забараняць) рабіць гэта іншым.

Магчымасць мець аўтарскія правы не мае ўзроставых абмежаванняў — дзеці да 18 гадоў, якія стварылі нейкі прадукт інтэлектуальнай дзейнасці, валодаюць гэткім жа наборам правоў на яго, як і дарослыя, якія зрабілі б тое ж самае. Аднак у дачыненні да аўтараў-дзяцей ёсць асаблівасць па рэалізацыі правоў, якімі яны валодаюць. Да 14 гадоў ажыццяўляць правы аўтараў самастойна яны не могуць — гэта робяць іх законныя прадстаўнікі. З 14-ці падлеткі могуць рэалізоўваць свае аўтарскія правы самастойна ў поўным аб'ёме.

Трэба разумець, што важны не толькі аб'ект інтэлектуальнай уласнасці, але і правы на яго, таму яны ахоўваюцца дзяржавай. За парушэнне аўтарскіх правоў прадугледжана адказнасць, у тым ліку адміністрацыйная. І да яе, напрыклад, за незаконнае выкарыстанне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, могуць быць прыцягнуты ў тым ліку і падлеткі ад 16 гадоў.



Дзеці-вынаходнікі

Творчая дзейнасць не залежыць ад узросту, бо да яе схільныя і дарослыя, і дзеці. Для апошніх творчасць нават больш характэрна, паколькі дзеці не абмежаваны рамкамі культуры, моды, нейкімі эстэтычнымі перавагамі. Іх розум больш гнуткі, не абмежаваны навуковымі адкрыццямі і тэарэмамі, якія складаюць аснову навуковых ведаў аб наваколлі, упэўнена **Вольга НІКІФАРАВА, вядучы спецыяліст аддзела права прамысловай уласнасці і дагавораў упраўлення прававога і кадравага забеспячэння НЦІУ:**

— Ва ўсе часы дзеці ствараліаб'екты інтэлектуальнай уласнасці. Сальвадор Далі, напрыклад, напісаў сваю першую карціну ў шэсць гадоў. Валянцін Сяроў стварыў партрэт «Ляля» ў 15, а Пабла Пікаса ў восем гадоў напісаў свайго «Пікадора». Вядома і шмат дзяцей-вынаходнікаў. Луі Брайль прыдумаў свой знакаміты шрыфт у 15 гадоў, а 13-гадовы Дзмітрый Рэзнікаў — зубную шчотку для касманаўтаў. Жозэф Бамбардзье стварыў першы ў свеце правобраз снегаходу.

Дзіцячая творчасць уносіць значны ўклад у развіццё мастацтва, літаратуры і навукі. Дзецям-вынаходнікам нават прысвечана свята, якое адзначаецца 17 студзеня ў дзень нараджэння Бенджаміна Франкліна, які ў 13 гадоў стварыў ласты для рук.

А ў Беларусі для папулярызацыі сярод дзяцей навукі і вынаходніцтваў арганізоўваецца нацыянальны навукова-інжынерны конкурс Белсэф. Летась найвышэйшымі прызавымі месцамі ў ім былі адзначаны такія вынаходніцтвы, як «Выкарыстанне пластыкавых бутэлек для стварэння наглядных дапаможнікаў па біялогіі пасродкам 3D-друку (распрацоўка Праплёткінай Надзеі з Мінска). А таксама «Даследаванне магчымасцяў выкарыстання газавых разрадаў у дэфектаскапіі металічных канатаў» (распрацоўка Вабішчэвіча Івана з Брэсцкай вобласці), расказала Вольга Нікіфарава:

— Беларускія дзеці-вынаходнікі ўдзельнічаюць і ў міжнародных конкурсах. Бронзавымі прызёрамі XVII Міжнароднай выставы юных вынаходнікаў летась сталі два беларускія вынаходнікі: Аляксандр Чэрній — аўтар сонечнай печы-грыля і Максім Яроменка — аўтар прылады для аблягчэння перасоўвання людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У 2022-м сярод пераможцаў міжнароднага дзіцячага конкурсу «Школьны патэнт — крок у будучыню» таксама былі школьнікі з Беларусі. Напрыклад, Раман Рабцаў і Павел Сыс з Віцебска, якія распрацавалі шматфункцыянальную прыладу для аўтаматычнага маніторынгу мікраклімату. А таксама Аляксей Карнішоў з Віцебска, які стварыў мабільную робататэхніку — робата-пагрузчыка «біг-фут».

Падтрымаць юных пісьменнікаў

Дапамагаюць дзецям раскрываць свае здольнасці ў Беларусі нават бібліятэкі. Напрыклад, 18 установаў цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк сталіцы штогод наведвае больш за 900 тысяч чытачоў.

— Тут дзеці могуць знайсці самую розную інфармацыю і прыходзіць усёй сям'ёй, а прававая база бібліятэк штомесяц абнаўляецца, — запэўніла **Таццяна ШВЕД, дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска.** *— За год мы праводзім каля чатырох тысяч мерапрыемстваў. А ў часы пандэміі бібліятэкі сталі даваць праз інтэрнэт інфармацыю пра новыя паступленні ў бібліятэчны фонд і такім чынам захавалі сваю запатрабаванасць.*

Бібліятэкары зацікаўлены ў тым, каб дзеці не толькі заахвочваліся творамі мастацтва, а і самі ствараліх. Каб падтрымаць юных чытачоў, бібліятэкары анансавалі ў лютым на кніжнай выставе-кірмашы кнігу, якую напісала адна з чытачак 10-й бібліятэкі Мінска. А таксама зладзілі сустрэчу з яе патэнцыйнымі чытачамі — такімі ж падлеткамі, як і яна.

— Актыўна працуем мы і са сталічным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 15-й бібліятэцы працуе клуб-студыя «Малінаўскія галасы». Дзякуючы саюзу і Іне Фраловай нашы чытачы могуць рэалізаваць права апублікаваць свае вершы, — дадала бібліятэкар. *— Увагу аддаём і дзецям з абмежаванымі магчымасцямі. Спецыяльна набываем кнігі з буйным шрыфтам альбо можам прынесці кнігі дадому, калі ёсць такая патрэба.*

У тэму

Сёлета Нацыянальны інстытут інтэлектуальнай уласнасці разам з Мінадукацыі, Дзяржкамітэтам па навуцы і тэхналогіях і Саветам маладых вучоных НЦІУ ладзіць сярод вучняў 9—11 класаў конкурс «Адкрываючы свет інтэлектуальнай уласнасці».

Мерапрыемства мае на мэце сумяшчэнне адукацыйнага і спаборніцкага элементаў дзеля распаўсюджвання ведаў у сферы інтэлектуальнай уласнасці і стымуляванння навучэнцаў да праслухоўвання лекцыйных матэрыялаў, кажуць арганізатары конкурсу. Да ўдзелу ў ім, дарэчы, заахвочваюцца не толькі вучні выпускных класаў, але і школьнікі іншых класаў.

Конкурс, які будзе адбывацца да 31 снежня ўключна, пройдзе ў чатыры этапы. Першы стартуе ўжо 1 кастрычніка. Удзельнікаў чакаюць анлайн-лекцыі і заданні ў сферы інтэлектуальнай уласнасці, а пераможцаў — каштоўныя прызы. У межах конкурсу праводзяцца таксама дзве дадатковыя намінацыі: «Найлепшы настаўнік» і «Найлепшая школа». Пакінуць заяўку на ўдзел можна на сайце НЦІУ ncip.by/openwip/.

Ірына СІДАРОК.

«Віта» значыць «жыццё»

АДКУЛЬ ЖА ІМ УЗЯЦЦА?

У спісе вітамінаў — 13 найменняў (А, групы В (B_1, B_2, B_6, B_{12}, РР), С, D, E, K, а таксама фоліевая і пантатэнавая кіслоты). Практыка называння вітамінаў літарамі лацінскага алфавіта склалася, паколькі першапачаткова іх хімічная формула была невядомая. І іх проста называлі літарамі — менавіта ў тым парадку, у якім адкрывалі.

Сучасная дыеталогія дзеліць вітаміны на тлушчараствараль-ныя (A, D, E, K) і водараствараль-ныя (усе астатнія). Не лішнім будзе «ведаць іх у твар».

Вітамін А (рэцінол) неабходны для росту, развіцця і рэгенерацыі тканак, працэсаў рэпрадукцыі, падтрымання актыўнасці імуннай аховы, засцярогі скуры і слізістых абалонак ад паражэнняў, забеспячэння нармальнай функцыі вачэй, з'яўляецца моцным антыаксідантам, распавядае Алена Маргунова. Крыніцы вітаміну А сярод прадуктаў раслінnага паходжання — морква, шпінат, памідоры, гарбузы, зялёны гарошак. А таксама сметанковае масла, печань, малако і смятана.

— ***Вітамін D (кальцыферол)*** удзельнічае ў абмене кальцыю і фосфару: паскарае ўсмоктванне гэтых рэчываў з кішэчніка і яго адкладанне ў касцявой тканцы, а таксама паляпшае імунітэт. Пры дэфіцыце вітаміну D затрымліваюцца ўтварэнне, рост і аднаўленне касцявой тканкі. Крыніцы вітаміну D — яйкі, марскі акунь, печань, вяршкі, смятана.

Вітамін Е (такаферол) валодае самым моцным антыаксідантным дзеяннем: засцерагае клеткі ад пашкоджвальнага ўздзеяння актыўных формаў кіслароду.

— Аднак для эфектыўнага дзеяння гэтага вітаміну неабходны вітамін С, які яго рэактывуе. У сваю чаргу, вітамін Е рэактывуе вітамін А і ўбіхінон (каэнзім Q10). Такаферол памяншае ўтварэнне тромбаў, перашкаджае развіццю атэрасклерозу сасудаў.

Атрымаць вітамін Е можна, ужываючы ў ежу арэхі і курагу, шыпшыну, цэльназбожжавыя вырабы з пшаніцы. А яшчэ на гэты вітамін багатае мяса кальмара.

Вітамін К (філахінон, менахінон) забяспечвае нармальную згусальнасць крыві і падтрымлівае стан касцявой тканкі, удзельнічае ў сінтэзе бялкоў, валодае антыаксідантным дзеяннем.

— Патрэба ў вітаміне К на 100 % задавальняецца за кошт яго сінтэзу мікрафлорай кішэчніка. Да таго ж ён прысутнічае ў многіх прадуктах харчавання, — кажа Алена Міхайлаўна. — Таму атрыманне яго з ежы не адыгрывае ролі ў развіцці гіпавітамінозу.

«Каб «вітаміны ў таблетках» прынеслі найбольшую карысць, сачыце, каб сутачная доза забяспечвала 50-100 % патрэбы арганізма. Інфармацыя аб гэтым размешчана на этыкетцы або лістку-ўкладышы. Калі вы прымаеце якія-небудзь лекі і вырашылі пачаць прыём вітамінаў, парайцеся з урачом. У некаторых выпадках такая камбінацыя можа аказацца непажаданай. А ў некаторых — наадварот, да лячэння лепш дадаць тыя ці іншыя вітаміны».

«ЗНАКАМІТЫ ВІТАМІН» І ЯГО «КАЛЕГІ»

Мабыць, самы вядомы з групы водараствараль-ных вітамінаў — праслаўты вітамін С, які сапраўды вельмі неабходны чалавеку.

— ***Вітамін С (аскарбінавая кіслата)*** выконвае ў арганізме мноства важных функцый: з'яўляецца антыаксідантам; перашкаджае развіццю атэрасклерозу; удзельнічае ў сінтэзе гармонаў кортыкастэроідаў у надныракоўніках; забяспечвае сінтэз калагену з тропакалагену і такім чынам падтрымлівае нармальны стан злучальнай тканкі; удзельнічае ў сінтэзе і метабалізме гармонаў шчытападобнай залозы; паляпшае ўсмоктванне жалеза з кішэчніка; нейтралізуе нітразаміны, якія ўтвараюцца ў страўніку пры ўжыванні ежы, што змяшчае нітраты і нітрыты (глыбока перапрацаваныя прадукты), якія могуць спрыяць узнікненню раку страўніка; паляпшае працэсы гаення тканак арганізма, пашкоджаных у выніку траўмаў або хвароб. І, вядома, умацоўвае імунітэт, — кажа Алена Маргунова.

На вітамін С багатыя салодкі і востры перац, чырвонакачанная капуста, хрэн, чарамша, чорныя парэчкі, цытрусавыя, абляпіха, ківі, суніцы.

Вітамін B_1 (тыямін) удзельнічае ў абмене многіх рэчываў у арганізме, у першую чаргу — вугляводаў. Паколькі вугляводы ўносяць асноўны ўклад у забеспячэнне арганізма чалавека энергіяй, вітамін мае таксама вялікае значэнне для працэсаў энергетычнага абмену. Неабходны для біясінтэзу найважнейшага мясцовага правадніка нервовых імпульсаў — ацэтылхаліну, без дастатковай колькасці якога немагчыма нармальная нервовая рэгуляцыя перыферычных органаў і сістэм. Крыніцы вітаміну B_1 — пшаніца, аўсянка і грэчка, кедравыя арэхі, свініна, кеш'ю.

Вітамін B_2 (рыбафлавін) уваходзіць у склад ферментаў, якія ўдзельнічаюць у працэсах акіслення і энергетычнага абмену ў клетках, і такім чынам забяспечвае эфектыўнасць найважнейшага фізіялагічнага працэсу — абнаўлення тканак арганізма. Ён удзельнічае ў сінтэзе зрокавага пігменту — пурпуру, які засцерагае сятчатку вока ад уздзеяння ўльтрафіялетавага выпраменьвання. Вітамін B_2 вельмі адчувальны да святла: калі малако захоўваецца ў шкляным посудзе, яно страчвае значную колькасць рыбафлавіну. На гэты вітамін багатыя часнок і фасоля, скумбрыя і сардзіны, курыца, гранат. А таксама хлеб з мукі грубага памолу, любая зялёная гародніна і лясныя грыбы, субпрадукты (печань, ныркі, сэрца, язык).

«Вітаміны — гэта складаныя біялагічна актыўныя рэчывы. Яны бяруць удзел ва ўсіх жыццёвых працэсах. І пры гэтым некаторыя з іх не ўтвараюцца ў арганізме чалавека або ўтвараюцца ў недастатковай колькасці».

Вітамін РР (B_3, ніацін, нікацінавая кіслата) удзельнічае ў многіх акісляльных біяхімічных рэакцыях у тканінах, забяспечвае нармальную інтэнсіўнасць энергетычнага абмену.

— Чым вышэйшая энергетычная каштоўнасць рацыёну, тым больш патрэба ў вітаміне РР, — падкрэслівае спецыяліст.

Найважнейшыя харчовыя крыніцы вітаміну РР — семачкі сланечніка, свежыя грыбы, бабовыя, грэчка, а таксама печань, дрожджы і арахіс.

Вітамін В5 (пантатэнавая кіслата) уваходзіць у склад амаль 80 ферментаў страўнікава-кішачнага тракта. Кішэчная мікрафлора ў норме сінтэзуе 3,4 мг пантатэнавай кіслаты ў суткі. Вітамін B_5 ўдзельнічае ў розных працэсах абмену рэчываў, сінтэзе тлушчаў і стэроідаў. Харчовыя крыніцы вітаміну B_5 — гарох і фасоля, яйкі і субпрадукты (печань, ныркі).

— Але памятайце: вітамін B_5 значна разбураецца пры цеплавой апрацоўцы.

Вітамін B_6 (пірыдаксін) вельмі важны дзякуючы яго актыўнаму ўдзелу ў многіх відах абмену, але найбольшае значэнне ён мае для абмену бялкоў. Таму патрэба ў ім павышаецца пры павелічэнні колькасці бялкоў у рацыёне. Атрымаць B_6 можна з піўных дражджэй, пшанічнага вотруб'я, субпрадуктаў — нырак, печані або сэрца.

Фоліевая кіслата, падобна да вітаміну B_{12}, удзельнічае ў дзяленні клетак і крывятварэнні, неабходная для ўтварэння дэзаксірыбануклеінавай кіслаты (ДНК), многіх біялагічна актыўных рэчываў. Крыніцы фоліевай кіслаты — шампіньёны і белыя грыбы, цыбуля-парэй, ліставая гародніна, брокалі.

А КАЛІ З АПТЭКІ?

— Важна разумець, што асноўны шлях атрымання вітамінаў — гэта найперш збалансаванае харчаванне, — падкрэслівае Алена Міхайлаўна. — І ўсё ж нават паўнавартасны рацыён не можа цалкам пакрыць патрэбнасць арганізма ў вітамінах. Таму пры выбары прадуктаў я раіла б аддаваць перавагу узбагачаным вітамінамі (выпускаюцца такія хлебабулачныя, малочныя прадукты, мясныя паўфабрыкаты і г. д.). І яшчэ адзін савет па «вітаміннай бяспецы» — двойчы на год праводзіць прафілактыку гіпавітамінозу. На працягу месяца-двух праціць вітамінны комплекс. Лепш за ўсё зрабіць тое восенню і ранняй вясной.

— Існуе меркаванне, што вітамінныя комплексы — гэта «хімія» і лепш аддаць перавагу «натуральным вітамінам» з прадуктаў харчавання...

— Сучасныя вітамінныя прэпараты не адрозніваюцца па сваёй фізіялагічнай актыўнасці ад вітамінаў з ежы. Многія з іх атрымліваюць з дапамогай біятэхналогій, так што называць «хіміяй» полівітамінныя комплексы некарэктна. Каб «вітаміны ў таблетках» прынеслі найбольшую карысць, сачыце, каб сутачная доза забяспечвала 50-100 % патрэбы арганізма. Інфармацыя аб гэтым размешчана на этыкетцы або лістку-ўкладышы. Калі вы прымаеце якія-небудзь лекі і вырашылі пачаць прыём вітамінаў, парайцеся з урачом. У некаторых выпадках такая камбінацыя можа аказацца непажаданай. А ў некаторых — наадварот, да лячэння лепш дадаць тыя ці іншыя вітаміны.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

❍ Дарэчы

ПРАВІЛЫ ЗДАРОВАЙ ВОСЕНІ

Якія прадукты варта дадаць у рацыён цяпер, каб умацаваць імунітэт да зімы?

Бружмель. Ён змяшчае карысныя арганічныя кіслоты, вітаміны групы В і С, мікраэлементы — жалеза, медзь, цынк, ёд.

— Гэтыя ягады выдатна спраўляюцца з анеміяй, спрыяюць умацаванню сасудаў і падтрымліваюць імунітэт, — адзначае **ўрач-гігіеніст Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Фрунзенскага раёна Мінска Валянціна ГАПАНОВІЧ.**

Бацвінне. Раней мала звярталі ўвагі на гэтую каштоўную крыніцу вітамінаў. Сёння даказана, што *лісце морквы, радыскі, рэпы* і *буракоў* карыснае не менш за караняплоды.

— З бацвіннем варта гатаваць салаты, смузі, супы, запяканкі, рагу, а таксама нарыхтоўваць яго на зіму. У «вяршках» морквы змяшчаецца больш караціну і правітаміну А, чым у «карэньчыках». Бурачнае бацвінне добрае пры праблемах са страўніка-кішачным трактам і спрыяе абнаўленню крыві, а лісце рэпы і радыскі поўнае вітамінамі і мікраэлементамі.

Рачная і сажалкавая рыба. Увосень якраз праходзяць сезонныя рыбныя кірмашы, якія не варта прапускаць.

— У чым перавага свежай рыбы? Любы бялок пры замарожванні часткова разбураецца, а ён патрэбны для ўтварэння новых касцей, мышцаў, крыві.

Сезонныя памідоры. Яны з плямкамі і не заўсёды правільнай формы, але ў іх — само жыццё: вялікая колькасць вітаміну С, групы В, бэта-караціну (правітаміну А), практычна поўны набор мікра- і макраэлементаў, адзначае суразмоўніца.

— Асабліва шмат калію, які неабходны для сэрца і касцей. Таксама ў таматах утрымліваецца лікапін — антыаксідант, што спрыяе ачышчэнню і амаладжэнню клетак. Максімальная канцэнтрацыя — у памідорах, якія прайшлі тэрмічную апрацоўку. Так што гатуем з таматаў салаты і рагу.

Часнок. Чым ён маладзейшы, тым больш у ім карысці. Часнок новага ўраджаю варта і назапасіць на зіму, і ўключыць у рацыён цяпер. Яго сакрэт — у фітанцыдах і аліцыне (біялагічна актыўным рэчыве, якое знішчае хваробатворныя мікробы і грыбы ў арганізме чалавека), адзначае ўрач.

— Адчуванне пякоты ў роце пры ўжыванні часнаку не шкодзіць слізістай страўніка. Яго могуць есці нават людзі з гастрытам і язвай. Таксама ў часнаку ёсць вітаміны групы В і С, вугляводы, магній, кальцый, фосфар, хлор, ёд і іншыя мікраэлементы. Акрамя моцнай падтрымкі імунітэту, малады часнок нармалізуе крывяны ціск і абмен рэчываў, дапамагае вывядзенню халестэрыну і ўмацоўвае сасуды.

БШПЗ

ШЫРОКАЯ

Як беларускія шпалы заваявалі рынкі

Магутныя пад'ёмныя краны забяспечваюць бесперабойную пагрузку і разгрузку.

Прадукцыя гэтага беларускага прадпрыемства выкарыстоўваецца на касмадроме Плісецк, у маскоўскім і санкт-пецярбургскім метрапалітэнах, на буйных горна-абагачальных камбінатах «Міхайлаўскі» і «Лебядзінскі». Сёлета яе закупіў і найбуйнейшы ў свеце вытворца нікелю — Горна-металургічнай камбінат «Нарыльскі нікель». Сёння больш за 60 % сваёй прадукцыі ААТ «Барысаўскі шпалапрапітны завод» адгружае на экспарт. А сакрэт устойлівай работы прадпрыемства — у высокай якасці прадукцыі і адказным стаўленні да сваіх абавязацельстваў.

Дырэктар завода Генадзь ПРАСМЫЦКІ.

Створаны па імператарскім распараджэнні

Гісторыя гэтага аднаго з найстарэйшых прадпрыемстваў звязана з развіццём Барысава, дакладней, з пракладкай у гэтым горадзе чыгункі.

Аб заснаванні завода нагадвае мемарыяльны знак на тэрыторыі прадпрыемства.

У 1871 годзе была пабудавана чыгуначная станцыя Барысаў (яна знаходзілася за 5 км ад тагачаснага горада), і праз горад пачаўся рэгулярны чыгуначны рух. Але для далейшага будаўніцтва Маскоўска-Брэсцкай чыгункі патрабавалася ўсё больш шпал. У той час яны былі толькі драўляныя. Адчувалася вострая патрэба ў будаўніцтве адпаведнага завода.

У гістарычных архівах захаваўся цікавы дакумент — распараджэнне самога імператара Мікалая II аб адабранні земляў мясцовага памешчыка Івана Каладзеева, якія прылягалі да станцыйнай тэрыторыі: «для будовы шпалапрапітнага завода і водаправода да яго ... аказалася неабходным заняць зямлю з яе прыпасамі ў колькасці чатырох тысяч сямісот сарака квадратных сажань». Цікава, што заплаціў памешчыку менш, чым ён разлічваў: «ва ўзнагароджанні ўладальніка паступіць на падставе агульных узаконенняў аб маёмасцях, якія адчужаюць па распараджэнні Урада». Адметна, што і цяпер завод знаходзіцца на тых тэрыторыях, а непадалёк ад яго — музей домсядзіба Івана Каладзеева.

Такім чынам, на будаўніцтва прадпрыемства былі выдаткаваны грошы, і ў перыяд з 1900 да 1902 года на месцы балота быў пабудаваны Барысаўскі шпалапрапітны завод. Ён займаў крыху больш за два гектары (цяпер тэрыторыя прадпрыемства — каля 12 га). Драўніну насычалі ўручную, і выпуск прадукцыі быў нязначны. Між тым патрэба чыгункі ў ёй расла. А значыць, варта было ўдасканальваць тэхналогію. І ўжо тады пачаў укараняцца метад аўтаклаўнага насычэння драўніны дзягцярным хімічным растворам.

Маладое прадпрыемства хутка расло: у 1910 годзе тут працавала ўжо паўтысячы рабочых. Завод вырабляў прадукцыю сезонна: з красавіка да верасня. Праца на ўсіх этапах была ручной. Ваганеткі, нагружаныя шпаламі, падаваліся ў прапітныя цыліндры, якія закрываліся 46—58 балтамі. Асобны рабочы быў патрэбны толькі на тое, каб іх закручваць-раскручваць. Усё астатняе — таксама ручная праца: абчэсванне шпал, пагрузка, разгрузка і перамяшчэнне ваганетак па тэрыторыі завода.

Неаднаразова аднаўляўся з нуля

Падчас вайны і рэвалюцый завод перажываў няпростыя часы, але як ні дзіўна, кожны раз аднаўляўся. У Першую сусветную вайну ён амаль перастаў працаваць, бо большасць рабочых прызвалі ў войска. Пераважная частка вытворчых памяшканняў і абсталявання завода былі разбураны. Аднак у раннім СССР пытанне аднаўлення чыгуначнага транспарту стаяла на першым месцы, і завод у пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя атрымаў другое жыццё.

Падчас Другой сусветнай вайны прадпрыемства зноў было на акупаваных тэрыторыях. Немцы, выкарыстоўваючы працу ваеннапалонных, імкнуліся наладзіць вытворчасць шпал, бо на чыгуначных пуцях партызаны нярэдка праводзілі акты помсты, разбураючы вялікія ўчасткі пуцей. Падчас адступлення немцы вывезлі найбольш каштоўнае абсталяванне, а астатняе знішчылі, падарваўшы галоўны корпус прадпрыемства.

Аднаўляць завод давялося літаральна з нуля, і гэта заняло тры гады. Збіралі рабочых, запрашалі спецыялістаў, адбудоўвалі памяшканні, рамантавалі пад'язныя пуці, па ўсім саюзе шукалі абсталяванне.

У савецкі час завод неаднаразова перажываў рэканструкцыю: мяняліся абсталяванне і тэхналогіі, будаваліся новыя цэхі. Першая рэканструкцыя прыйшлася на 1958 год. Састарэлыя насычальныя цыліндры з балтавым мацаваннем (як памятаем, гэта каля паўсотні балтоў, якія закручваліся ўручную) былі заменены новымі з паўаўтаматычным мацаваннем накрывак.

У 1961 годзе на прадпрыемстве з'яўвіўся першы казлавы кран: было адсыпана два гектары забалочанай тэрыторыі, дзе і ўстанавілі абсталяванне, якое аблегчыла пагрузку і перамяшчэнне прадукцыі па тэрыторыі завода. У хуткім часе манціруюцца і ствараюцца другі і трэці казлавыя краны. А на замену вузкакалейным паравозам нарэшце прыходзяць матавоз і цеплавоз. У 70—80 гадах на прадпрыемстве з'явіліся новыя казлавыя краны і цеплавозы. У 80-я праведзена поўмаштабнае абнаўленне пуцявой гаспадаркі.

У гэтым цэху драўніна апрацоўваецца ў магутных аўтаклавах: пасля шпалам не страшныя ні вільгаць, ні гніль, ні насякомыя.

Не здаў сваіх пазіцый завод і ў 90-я. Напрыклад, у 1990 годзе ён працаваў кругласутачна, забяспечваючы сваёй прадукцыяй усю Беларусь, амаль трэць патрэб Украіны, Літву, Латвію і шэраг іншых спажыўцоў. Для будаўніцтва чыгункі шпал неабходна было ўсё больш, аднак магутнасці прадпрыемства не маглі задаволіць попыт. Таму яшчэ ў 1987 годзе Міністэрства пуцей зносін СССР прыняло рашэнне аб маштабнай рэканструкцыі. Аднак са змяненнем палітычнай і эканамічнай абстаноўкі планы так і засталася на паперы.

З развалам СССР геаграфія паставак звузілася, а спажыўцы з-за адсутнасці сродкаў не маглі разлічыцца за прадукцыю. Але менавіта тады прадпрыемства, шукаючы выйсце, заключыла выгадныя кантракты з суседнімі краінамі, прычым не з чыгуначнікамі, а з металургамі і шахцёрамі.

Гатовая прадукцыя адпраўляецца ў больш чым дзясятак краін.

Новае стагоддзе — новыя гарызонты

Тым часам набліжалася новае стагоддзе. У сусветнай вытворчасці шпал адбыліся істотныя змены, удасканальваліся тэхналогіі насычэння драўніны. Ды і існуючая з 40-х гадоў тэхналогія насычэння шпал пад ціскам у аўтаклавах даўно састарэла. Да таго ж яна забруджвала навакольнае асяроддзе, вялікіх выдаткаў патрабавалі ўкладанні ў ачыстку глебы, паветра і вады. Вырашана было звярнуцца да навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук, якія і распрацавалі новую тэхналогію асэпціравання драўніны. Яна ахоўвала ад загарання, дрэваразбуральных грыбоў, гнілі і шкодных насякомых.

Адначасова вялася работа па зніжэнні энергазатрат пры насычэнні драўніны сланцавым маслам. І такая эмульсія была знойдзена: сумесь сланцавага масла, вады і шчолачы дазваляла разаграваць антысептык не да 105 градусаў, а ўсяго да 50, што змяншала выпарэнне.

Вялікая рэканструкцыя прадпрыемства пачалася ў 2000 годзе і завяршылася ў 2006-м. Трэцяга жніўня 2000-га, у дзень 100-гадовага юбілею завода, была забіта пробная свая новага цэха.

Першы этап рэканструкцыі прадпрыемства складаўся з будаўніцтва склада натуральнай сушкі шпал на 60 тысяч кубаметраў драўніны. Дарэчы, сёння тут адначасова можа знаходзіцца да 120 тысяч шпал і 180 камплектаў стрэлачных пераводаў. Другі этап уключаў узвядзенне бытавога корпуса, мантаж ачышчальных збудаванняў і цэха насычэння раствору. Трэці этап — заканчэнне будаўніцтва цэха насычэння драўніны. Была змантіравана лінія кантавага мацавання шпал металічнымі пласцінамі, распрацаваная і выбраленая Баранавіцкім заводам аўтаматычных ліній.

Рэканструкцыя прынесла свой плён: істотна палепшылася экалагічная абстаноўка. Антысептык перастаў трапляць у грунтавыя воды і ў раку Бярэзіну. Значна зменшыліся выкіды шкодных рэчываў у атмасферу. Скарацілася колькасць працоўных месцаў з павышаным утрыманнем шкодных рэчываў. Была ўдасканалена сістэма пажарнай бяспекі — пракладзены кальцавы водаправод дыяметрам 200 міліметраў з установкай 24 лафетных вышак, вада на іх падаецца з хуткасцю 60 л/секунду. З'явілася магчымасць насычэння драўніны рознымі антысептыкамі.

Многія новаўвядзенні дазволілі адмовіцца ад састарэлых вытворчых аперацый. Напрыклад, са змяненнем насычэння драўніны адпала неабходнасць выкарыстоўваць пару для разагравання антысептыкаў, што дазволіла рэканструяваць кацельню. Цяпер тут працуе кацельня модульнага тыпу з двума вадагрэйнымі каталамі на прыродным газе.

З 2000 года вытворчыя магутнасці Барысаўскага шпалапрапітнага завода дазвалялі насычаць звыш 600 тысяч шпал у год.

Мільён шпал у год

З пачатку нулявых праводзіцца работа па ўкараненні новых відаў антысептыкаў, адпрацоўваліся новыя віды насычэння. Пры гэтым упор рабіўся на зберажэнне энергарэсурсаў,

МАГІСТРАЛЬ

ад Інданезіі да Дальняга Усходу

Завод аснашчаны сучаснай універсальнай тэхнікай. Гэты аўтамабіль рухаецца не толькі па звычайнай дарозе, але і па чыгуначных рэйках.

эканамічнасць вытворчасці, далейшае паляпшэнне ўмоў працы. Істотную дапамогу па ўкараненні новых антысептыкаў на прадпрыемстве аказалі навуковыя супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. У 2009 годзе на прадпрыемстве былі распрацаваны і ўкаранёны новыя насычальныя біяахоўныя растворы на аснове антысептыкаў TANALITH E, якія не патрабуюць падагрэву, а ў 2010 годзе на ААТ «Барысаўскі шпалапрапітны завод» распрацаваны і ўкаранёны насычальны састаў «Сродак ахоўны СМПС».

Прыярытэтнай задачай прадпрыемства стала выкарыстанне водараствральнага антысептыку. Наразе з традыцыйнымі алейнымі прымяняецца водараствральны састаў англійскай вытворчасці, які праз 48 гадзін становіцца цалкам бясшкодным. Гэта дае магчымасць выпускаць прадукцыю не толькі з высокай эксплуатацыйнай якасцю, але і экалагічна бяспечную, што з'яўляецца абавязковай умовай паспяховых продажаў, у тым ліку і на знешніх рынках.

У 2013 годзе завод пераўзышоў адну маштабную мадэрнізацыю. Гэта дазволіла павялічыць праектныя магутнасці да 1 мільёна шпал у год. Была ўведзена лінія павярхоўнай наколкі шпал і забіўкі кантавых пласцін. Дзякуючы ўкараненню гэтай тэхналогіі скарацілася энергетычныя выдаткі на насычэнне шпал, павялічаны тэрмін іх эксплуатацыі. Тэхналогія адпавядае еўрапейскаму стандарту, што дазваляе прадухіляць заўчаснае растрэскванне шпал і брусаў пры іх эксплуатацыі, а таксама істотна спрашпал, бо ёсць участкі, дзе без іх не абысціся. Адзін з заказчыкаў Барысаўскага шпалапрапітнага завода — электрыфікаваная адной з першых Грузінская чыгунка — на выгнутых участках пуці ў горнай мясцовасці прымяняе толькі драўляныя шпалы.

На касмадроме Плісецк, дзе агульная працягласць чыгуначных пуцей дасягае амаль 330 км, па шпалах, вырабленых у Барысаве, перавозяць ракеты перад запускам у космас. На Міхайлаўскім горнаабагачальным камбінаце, адным з найбуйнейшых у СНД прадпрыемстваў па здабычы і ўзбагачэнні жалезнай руды, каля 260 км чыгуначных пуцей. Па іх з кар'ера горную пародку дастаўляюць на камбінат. Шпалы для прадпрыемства таксама вырабляюць у Барысаве. ААТ «Барысаўскі шпалапрапітны завод» пастаўляе сваю прадукцыю ў 12 краін. Найбольшую ўдзельную вагу ў экспарце займаюць усё ж спажыўцы з Расіі.

Сёлета прадпрыемства падпісала кантракт з найбуйнейшым у Расіі і свеце вытворцам нікелю і паладзію — Горна-металургічным камбінатам «Нарыльскі нікель». Барысаўскія шпалы былі пастаўлены на горна-металургічную вытворчасць расійскага прадпрыемства ў вялікім аб'ёме. Ёсць пастаўкі на такія буйныя расійскія прадпрыемствы, як аб'яднаная хімічная кампанія «Шчокінаазот», Стойленскі горнаабагачальны камбінат. Праяўляе цікавасць да прадукцыі Мурманскі марскі гандлёвы порт.

Самая дальняя кропка экспартных паставак барысаўскага завода — Інданезія. Летась у экспартным партвугалю ў порт на ўзбярэжжа Ахоцка мора. У кліматычных умовах гэтага рэгіёна могуць выкарыстоўвацца толькі драўляныя шпалы. І вытворчыя магутнасці Барысаўскага шпалапрапітнага завода, і якасць прадукцыі даюць яму канкурэнтную перавагу перад астатнімі вытворцамі.

Прыёмаздатчык грузаў Уладзімір АЛЯНІШКА.

Майстар лесапільнага цэха Аляксей НЕСЦЕРАЎ.

Намеснік дырэктара Юрый ЛЮТОМСКІ адказвае за геаграфію экспарту беларускіх шпал.

шчае працу па ўкладцы. Барысаўскі завод — адзіны сярод аналагічных вытворцаў на постсавецкай прасторы, хто мае такую вытворчую лінію.

Беларускія шпалы — ад касмадрома Плісецк да Нарнікеля

У выніку ўсіх удасканаленняў завод ператварыўся ў сучасную высокатэхналагічную вытворчасць. Гэта найбуйнейшы на сёння вытворца драўляных шпал, брусаў для стрэлачных пераводаў, маставых брусаў і іншай прадукцыі на еўрапейскай частцы былога Савецкага Саюза. Больш за 60 % прадукцыі ідзе на экспарт, каля 28—29 % набывае Беларуская чыгунка, 10—12 % пастаўляецца на ўнутраны рынак для іншых спажыўцоў. Гэта прадпрыемствы, у якіх ёсць пад'язныя і падкранавыя пуці, абсталяванне, якое перасоўваецца па рэйках.

І хоць у нашы дні на чыгунках шырока прымяняюцца жалезабетонныя канструкцыі, вырабы з драўніны паранейшаму незаменныя. Нават хуткасным чыгуначным магістралям Еўропы, па якіх пасажырскія цягнікі рухаюцца з хуткасцю 250–300 км/г і дзе шырока выкарыстоўваюць жалезабетонную рэйкашпальную рашотку, усё роўна штогод даводзіцца набываць каля мільёна драўляных

фелі прадпрыемства з'явіўся рынак Вялікабрытаніі. Туды пастаўлялася так званая садовая шпала. У гэтай краіне яна выкарыстоўваецца для агароджы тэрыторый. Так павялося з тых часоў, калі падчас рамонту чыгуначных пуцей вызвалялася шмат драўляных шпал, якія брытанцы прымянялі для агароджы. І гэта традыцыя захавалася да сённяшніх дзён. Садовая шпала насычаецца біяахоўным растворам на аснове антысептыкаў TANALITH. Атрымліваецца цалкам экалагічна бяспечны выраб. Летась у структуры экспарту пастаўкі ў Вялікабрытанію складалі аж да 20 %.

Вясной гэтага года ў прадпрыемства пачаліся цяжкасці з экспартам. З-за санкцый некаторыя экспартныя рынкі былі страчаны. Але праблемы ўдалося пераадолець, і цяпер прадпрыемства працуе стабільна. План па экспарце на бягучы год, а яго лічба, між іншым, складае 10 мільёнаў долараў, будзе выкананы загадзя — ужо ў наступным месяцы. Удалося гэта зрабіць найперш за кошт расійскага рынку, бо пастаўкі туды істотна павялічыліся. Знайшлі новыя кантракты ў Азербайджане і Грузіі.

Ёсць планы і на перспектыву. На Далёкім Усходзе рэалізоўваецца праект па будаўніцтве новай чыгункі, якая пройдзе з Якуціі да новага порта ў Хабараўскім краі. Новая дарога неабходная для транспарціроўкі

На рэйках абнаўлення

Пастаяннае абнаўленне вытворчага абсталявання з'яўляецца абавязковай умовай паспяховых продажаў. Сёлета каля мільёна рублёў уласных сродкаў выдаткавана на мадэрнізацыю матэрыяльна-тэхнічнай базы. У прыватнасці, быў закуплены новы двухбалачны маставы кран вытворчасці слуцкага кранавага завода. Новае абсталяванне дазволіць больш зручна размяркоўваць прадукцыю па цэху, сэканоміць час пры загрузцы ў вагоны. Пакуль ідуць пусканаладачныя работы, і цягам некалькіх дзён грузапад'ёмная тэхніка будзе запушчана.

Таксама сёлета ўдалося абнавіць машынна-трактарны парк і помпавае абсталяванне, уцяпліць фасад і адрамантаваць дах у адным з вытворча-бытавых карпусоў, пачаць рамонт адміністрацыйнага будынка.

Завяршаецца на прадпрыемстве рамонт і ўстаноўка дадатковага абсталявання на сушыльным комплексе для піламатэрыялаў. Яго, дарэчы, Беларуская чыгунка перадала прадпрыемству бясплатна. У наступным месяцы тут таксама пачнуцца пусканаладачныя работы. Працаваць сушыльны комплекс будзе на мясцовых відах паліва.

Летась было набыта новае вакуумнае абсталяванне для аўтаклаваў, якое дазваляе эканоміць час і электраэнергію, а таксама павысіць якасць насычэння шпал.

У найбліжэйшых планах кіраўніцтва завода — замена яшчэ аднаго маставога крана ў цэху насычэння. А таксама мадэрнізацыя казлавых кранаў: замена іх рухавікоў, электрыкі і кабін. На пляцоўцы натуральнай сушкі шпалы плануецца ўсталяваць навес для захоўвання пэўнага запасу прадукцыі ў зімовы перыяд. У прыярытэце і паляпшэнне санітарна-бытавых умоў для работнікаў. У прыватнасці, у цэху насычэння з'явіцца новыя бытавыя памяшканні, у тым ліку камфортныя пакоі прыёму ежы і душавыя.

Ёсць і больш глабальныя планы:

— У ідэале хацелася б адмовіцца ад казлавых кранаў і перайсці на сучасныя сківічныя пагрузчыкі, — дзеліцца думкамі **дырэктар ААТ «Барысаўскі шпалапрапітны завод» Генадзь ПРАСМЫЦКІ.** — Аднак для гэтага патрабуецца сур'ёзная падрыхтоўка інфраструктуры, у прыватнасці дарожнага пакрыцця. Тэрыторыя завода знаходзіцца ў пойме ракі, на былых балотах і тарфяніках. І якой бы таўшчыні ні была бетонная падушка, яна будзе разбурацца. Гэта вялікі ўчастак работы, аднак хацелася б яе ажыццявіць.

Работа па ўдасканаленні насычальных саставаў на заводзе вядзецца пастаянна.

— Мы працуем з навуковымі супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта над паляпшэннем саставаў. Летась распрацавалі дадатковую прысадку СМ1 для ахоўнага сродку СМПС. Гэта дазволіла знізіць фінансавыя выдаткі і часткова замяніць сланцавае масла, якое даводзіцца набываць у замежных вытворцаў. Новы састаў дазваляе прымяняць яго мінімальна і больш выкарыстоўваць піралізныя смолы айчыннага вытворцы — ААТ «Нафтан», — расказвае кіраўнік прадпрыемства.

Сумесна з супрацоўнікамі тэхналагічнага ўніверсітэта на тэрыторыі прадпрыемства створаны выпрабавальны палігон, дзе ў рэжыме рэальнага часу апрабуюцца розныя ўзоры насычэння. Супрацоўнікі ўніверсітэта вядуць усе назіранні і даследаванні. Праз 2-3 гады гэта дазволіць мець поўную карціну таго, як паводзяць сябе тыя ці іншыя саставы.

Калектыўная і асабістая адказнасць

— Якасць нашай прадукцыі, нашы вытворчыя магутнасці і адказнасць за ўзятыя абавязацельствы, — пералічвае складнікі паспяховай працы дырэктар прадпрыемства. — Калі мы заключылі кантракт, то выконваем яго да дробязяў, дакладна вытрымліваючы ўсе тэрміны і не завышаючы цэн.

На прадпрыемстве Генадзь Прасмыцкі працуе трэці год — з лістапада 2020 года. Да гэтага больш за 27 гадоў прысвяціў Беларускай чыгунцы. Апошнім часам узначальваў Аршанскую дыстанцыю ахоўных лесанасаджэнняў Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі. У зоне абслугоўвання былі ўчасткі ад расійскай да літоўскай граніцы, у тым ліку вытворчы ўчастак у Барысаве.

Сёння на Барысаўскім шпалапрапітным заводзе працуе адносна невялікі калектыў — 150 чалавек. Прадпрыемства штогод уваходзіць у лік пераможцаў гарадскіх конкурсаў. Летась заняло першае месца сярод прадпрыемстваў з колькасцю работнікаў да 500 чалавек па выніках сацыяльна-эканамічнай дзейнасці. Сёлета за восем месяцаў выканала ўсе планавапрагнозныя паказчыкі.

Сацыяльны пакет прадпрыемства ўключае 50-працэнтную кампенсацыю абедаў, што дастаўляюць работнікам на працоўныя месцы, аплату абанементаў у басейн і трэнажорную залу. Усім ахвотным аплачваецца санаторна-курортнае лячэнне, кожны работнік атрымлівае дапамогу на аздараўленне ў памеры аклада.

Выплачваюцца дапамогі для падрыхтоўкі дзяцей да школы, на набыццё гародніны. Ветэраны, якія адпрацавалі ад 10 гадоў на заводзе і сышлі адсюль на пенсію, атрымліваюць штомесячна па тры базавыя велічыні. Сярод прыемных бонусаў — і выплаты да юбілейных дат.

Алена КРАВЕЦ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 600012389

Лабарант хіманалізу Алена БАГАТЫРЭВА. У лабараторыі праводзяцца пробы драўніны перад падачай яе ў цэх насычэння і пасля, а таксама пробы насычальнага саставу.

РАБІЦЬ УРОКІ РАЗАМ ЦІ НЕ?

«Сын пайшоў у другі клас. Цяпер штовечар я раблю з ім урокі. Дык вось, нядаўна муж, пачуўшы, як я чарговы раз раздражняюся на Мішу, сказаў, што яго бацькі ніколі не кантралявалі, ці зрабіў ён «дамашку». «Усё было пад маю адказнасць. І вучыўся я заўсёды на «4» і «5», што ў школе, што ва ўніверсітэце». Задумалася: можа, і праўда я шкоджу дзіцяці?»

Марыя М., Мінск.

Чаму не варта рабіць урокі разам з дзіцем, патлумачыла дзіцячы псіхолаг Людміла ГУБСКАЯ.

«Перастаньце ўспрымаць свайго сына як малога, дэлегуйце яму права самому збіраць заплечнік і выконваць дамашнія заданні. Чым раней дзіця зразумее, што школа — яго зона адказнасці, што вучыцца яно само, а не мама, тым лепш для ўсіх. Вядома, па першым часе магчымыя і заўвагі, і дрэнныя адзнакі. Але рана ці позна ўсё нармалізуецца.

Не рабіць са школьнікам дамашнія заданні — не значыць цалкам самаўхіліцца. КАЛІ ДЗІЦЯ ПРОСІЦЬ, трэба нагадаць, колькі клетачак прапусціць, праверыць рашэнне задачы, дапамагчы разабрацца ў складаным пытанні. Зацікаўленасць жа да таго, каб выканаць дамашняе заданне і зрабіць гэта добра, павінна сфармаваць настаўніца.

Калі ўсе 11 гадоў стаяць над дзіцем, то гэтым яму не прывіць цікавасць да ведаў. Такім спосабам можна толькі адбіць жаданне вучыцца і, што самае страшнае, сапсаваць адносіны. Я кансультавала жанчыну, сын якой пасля дзявятага класа паступіў у тэхнікум. І гэта пры тым, што да 15 год ён быў круглым выдатнікам. Мама сядзела з ім над урокамі ўсе вечары напралёт, нават на выхадных рыхтаваліся да алімпіяды. У 15 год хлопец узбунтаваўся і сказаў: «Я ненавідзеў гэту вучобу ўсё сваё жыццё, а ты мяне мучыла». У выніку ён скаціўся ў вучобе так, што мама бегала па настаўніках, угаворвала, каб паставілі адзнаку вышэй. Школу хлопец закончыў, але бунтаваць не перастаў. Ён пачаў курыць, абуральна апранацца. Па сутнасці, бацькі атрымалі падлетка ў такім яркім праяўленні негатывізму да ўсяго, чаму яны яго вучылі да гэтага. Дык вось, каб так не атрымалася, адмоўцеся ад татальнага кантролю, у тым ліку і за выкананнем дамашніх заданняў. Бо школа — гэта ўсяго толькі адзін з этапаў жыцця, і яна не павінна станавіцца прычынай сямейных скандалаў. Беражыце здароўе і нервы — свае і сваіх дзяцей.

Акрамя таго, мамы, якія робяць урокі з дзецьмі, самі таго не разумеючы, рызыкуюць выхаваць несамастойную асобу, якая робіць усё па ўказцы. Такое дзіця будзе добрым выканаўцам, але не навучыцца прымаць рашэнні і браць на сябе адказнасць, у тым ліку і за нявывучаны ўрок. Больш за тое, прывыкшы да пастаяннага кантролю і падказак, школьнікі губляюць здольнасць самастойна спраўляцца са сваімі абавязкамі. Без дапамогі дарослых яны не ў стане не толькі рашаць задачы, але і правільна размяркоўваць час і нагрузку.

У сучасных дзяцей часта складанымі адносіны з часам: яны яго «не адчуваюць». А ўсё з-за таго, што за выкананнем раскладу сочаць дарослыя. Раю бацькам падарыць кожнаму дзіцяці механічны таймер, накшталт кухоннага (у выглядзе яек, памідораў): павярнуў — і пачынае цікаць. Ён мае лепшую сілу ўздзеяння, у адрозненне ад электроннага, выстаўленага на мабільным тэлефоне. Патлумачце сыну, што на хатняе заданне па кожным прадмеце адводзіцца не больш за паўгадзіны. Не паспеў — усё роўна пераходзь да наступнага. Калі дзіця кажа, што хоча адпачнуць пасля школы, то і час гульні варта дакладна акрэсліць. Так паступова яно навучыцца само размяркоўваць час.

Калі дзіця самастойна робіць урокі, у бацькоў з'яўляецца больш вольнага часу. Неўзабаве пры правільным планаванні вызваляцца вечары і ў школьніка. Раю бацькам хадзіць з дзіцем у музеі, наведваць выставы, ладзіць сумесныя кінапрагляды, гуляць усёй сям'ёй у настольныя гульні — гэта пакажа, што нейкіх ведаў яму не хапае, і выхавае жаданне даведвацца новае.

І яшчэ вельмі важна, каб у дзяцей з пачаткам новага навучальнага года захоўваліся абавязкі па доме. Грубая памылка, калі бацькі кажуць: «Ты, галоўнае, добра вучыся, а мы самі памыем посуд, прапыласосім». У выніку дзіця ўпусціць вельмі шмат.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

«Прыняць хрышчэнне ніколі не позна»

Што падштурхоўвае да гэтага дарослых людзей?

Хрышчэнне — адно з галоўных таінстваў хрысціянства. Лічыцца, што ў момант хрышчэння чалавек памірае для грахоўнага жыцця, каб адрадзіцца духоўна. У сучасным грамадстве рэдка сустрэнеш нехрышчонага чалавека. Але свядомы, глыбокі падыход да хрышчэння сустракаецца нячаста, кажуць святары. Менавіта так часцей за ўсё падыходзяць да таінства людзі, якія вырашаюць хрысціцца ў сталым узросце. Аб тым, што іх штурхае да гэтага кроку, мы запыталіся ў настаяцеля прыхода храма Свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага, святара Аляксандра ПАЛЬЧЭЎСКАГА.

Асаблівая сувязь чалавека і Бога

— Айцец Аляксандр, навошта прыходзяць хрысціцца дарослыя? Якія абставіны падводзяць людзей, што ўжо псіхалагічна склаліся і адбыліся ў жыцці, да рашэння прыняць гэтае таінства?

— За вонкавымі гісторыямі і тымі прычынамі, якія мы спрабуем самі для сябе вызначыць, стаіць нешта большае. Спробы растлумачыць рашэнне чалавека прыняць хрышчэнне абмежаваныя нашай мовай і чалавечым вопытам. На самай справе ў аснове гэтага рашэння — асаблівая сувязь чалавека і Бога, якую ён і сам для сябе не заўсёды можа растлумачыць. Чалавек адчувае асаблівы вопыт: Бог дакранаецца да яго душы, і ён адчувае ўнутраную патрэбнасць прыйсці ў храм, памаліцца і прыняць таінства хрышчэння. Хрышчэнне — гэта запавет Гасподні. Бачны, духоўны знак уваходжання чалавека ў Царкву (Царкву тут варта разумець як духоўны арганізм, і часткай Царквы можна стаць праз гэтае таінства). Іншымі словамі, хрышчэнне — гэта свайго роду «дзверы», увайшоўшы ў якія, чалавек трапляе ў Храм (у духоўным сэнсе гэтага слова). І заўсёды ў цэнтры такіх знешніх змен — імкненне адчуць прысутнасць Бога ў сваім жыцці.

— І ўсё ж якія знешнія падзеі звычайна падштурхоўваюць чалавека прыняць хрышчэнне?

— Здараецца, знешнія абставіны прыводзяць чалавека да духоўных пошукаў. Часам гэта страты, трагедыі ў сям'і, сур'ёзная хвароба, якую перанеслі блізкія або сам чалавек, — гэты вопыт адкрывае перад ім рэальнасць духоўнага свету. І чалавек шукае спосабы і сродкі рэалізаваць сувязь з Богам у сваім жыцці.

— А ці могуць гэта быць станоўчыя перамены?

— Даволі часта. Бо рашэнне хрысціцца звычайна звязана з жаданнем захаваць у сваім жыцці нейкі духоўны вопыт, станоўчыя перажыванні, падтрымаць тую сувязь з Богам, якая ўзнікла. Да хрышчэння прыходзяць людзі розных узростаў. Гэта могуць быць і падлеткі — я шмат сустракаў такіх хлопцаў і дзяўчат, якія былі не ахрышчаны пры нараджэнні, а да 15—17 гадоў адчулі патрэбу прыняць гэтае таінства і ўвайсці ў Царкву. Хоць нямала і сталых людзей, што адбыліся ў жыцці. Прымаюць хрышчэнне і пажылыя людзі. Нядаўна я хрысціў мужчыну, які ўсё жыццё прафесійна займаўся спортам, быў вядомым спартсменам. Цяпер яму каля 70 гадоў. Хрысціцца ён прыйшоў разам з жонкай і вельмі адказна падышоў да гэтага таінства. Прыняць хрышчэнне не позна ў любым узросце.

Пераход у новае жыццё

— Ці адрозніваецца хрышчэнне дарослага чалавека ад хрышчэння дзіцяці?

— І для дзіцяці, і для дарослага абрад хрышчэння прадугледжвае адну і тую ж паслядоўнасць выканання таінства, і гэтым падкрэсліваюцца значэнне і важнасць падзеі. Розніца ў тым, што за дзіця ручаюцца перад Богам хросныя бацькі. А дарослы падрыхтоўку праходзіць сам. У старажытнай царкве падрыхтоўка да хрышчэння дарослых магла доўжыцца ад аднаго да трох гадоў. Чалавек хадзіў у храм, удзельнічаў у нейкіх момантах набажэнстваў, вывучаў Святое Пісанне і традыцыі хрысціянства і толькі пасля гэтага станавіўся членам Царквы. Цяпер гэта займае нашмат менш часу — у розных храмах праводзіцца або адна гутарка, або цыкл гутарак. Чалавек праходзіць падрыхтоўку ў сярэднім на працягу месяца.

— Ці абавязковая споведзь перад хрышчэннем?

— Чалавек, які рыхтуецца прыняць хрышчэнне, яшчэ не з'яўляецца членам Царквы ў духоўным сэнсе, і таінства споведзі не можа быць здзейснена ў дачыненні да яго. Але ёсць такая практыка — перадхрышчальная споведзь, або духоўная гутарка са святаром, падчас якой той, хто рыхтуецца да хрышчэння, спавядае грахі за ўсё жыццё. Для яго гэта першы падобны вопыт. Святары кажуць, што ў гэтым ёсць сэнс — такая гутарка прыносіць велізарную карысць, дапамагаючы пераасэнсаваць пражытыя гады. Бо хрышчэнне — гэта нараджэнне ў новае духоўнае жыццё. Чалавек адмаўляецца ад грахоў, нейкіх ранейшых звычак... Перадхрышчальная споведзь не абавязковая, і тут трэба многае ўлічваць — у першую чаргу індывідуальныя асаблівасці чалавека: наколькі ён гатовы да такой гутаркі. Можа быць, яму неабходны час, каб паўнавартасна падрыхтавацца да споведзі.

— А як праходзіць сам абрад? Таінства звязана з трохразовым поўным пагружэннем, але чыста тэхнічна з дарослым гэта не заўсёды магчыма...

— Сапраўды, старажытны абрад хрышчэння звязаны з поўным пагружэннем. Выдатна, калі ў храме ўладкаваны баптыстэрыі, куды дарослы можа зайсці цалкам. Але не ў кожным храме ёсць такія збудаванні. Таму разам з практыкай пагружэння ёсць практыка аблівання вадой прыхрышчэнні. Абедзве яны паўнавартасныя і дзейсныя. На вялікія святы ў цёплы час года хрышчэнне можа праходзіць і на прыродзе — на беразе вадаёмаў.

Пачатак шляху

— Ці бывае няправільная матывацыя ў дарослых, якія вырашылі прыняць хрышчэнне? Дзяцей часам хрысцяць, «каб не хварэў і спаў добра». Ці часта ў гэтым пытанні памыляюцца і дарослыя?

— Такое бывае. Каб рашэнне прымалася свядома, а матывы яго былі верныя, мы і праводзім гутаркі. Імкнёмся высветліць, для чаго хрысціцца чалавек, растлумачыць сапраўдны сэнс і змест таінства. І ў некаторых выпадках — перанесці акцэнты з тых няправільных мэтаў, якія ставіць перад сабой чалавек, на мэты правільныя. Вельмі важна разумець, што хрышчэнне — гэта не самадастатковы абрад, які «механічна» здольны нешта змяніць да лепшага ў жыцці па-за ўдзелам людзей (дарослага, які прымае хрышчэнне, альбо бацькоў і хросных бацькоў

немаўляці), іх веры і ўсведамлення імі дакладных мэтаў і намераў. «Дзверы» ў храм адкрываюцца кожнаму, але, каб увайсці, трэба гэтага хацець. Без унутранай уцягнутасці (калі хрысцяцца «на ўсялякі выпадак» або «таму што ўсе так робяць»), гэты абрад «не працуе». Як і любое царкоўнае таінства. Важна ўсведамляць, што гэта працэс, які доўжыцца ўсё жыццё. Вам проста адкрылі дзверы, але ісці далей прыйдзецца самому. Не аднаму — разам з Богам, святымі, разам з вопытам царквы. За дзве тысячы гадоў па гэтым шляху прайшлі мільёны хрысціян. Мяне таксама хрысцілі калісьці, «таму што ўсе хрысцяць» — мае бацькі не былі глыбока верующымі людзьмі. І я свядома прыйшоў да веры, будучы ўжо дарослым. Хрышчэнне — гэта пачатак шляху да выратавання душы, але па гэтым шляху чалавек павінен ісці сам.

— Ці бывае, што пасля гутарак са святаром чалавек мяняе сваё рашэнне прыняць хрышчэнне? Хацеў — а потым перадумаў...

— Часам здараецца і так. У маёй практыцы гэта датычылася хросных бацькоў — яны раптам пачалі ўсведамляць усю сур'ёзнасць таго, што адбываецца, і сказалі: мы пакуль не гатовыя, нашы каштоўнасці і светапогляд далёкія ад тых прынцыпаў, на якіх стаіць хрысціянства. І гэта — шчыра. Магчыма, пройдзе нейкі час, гэтыя людзі змогуць нешта пераасэнсаваць і будуць гатовыя ўвайсці ў храм. Калі чалавек першапачаткова не гатовы да духоўнага росту, да руху да Бога, можа быць, хрысціцца яму пакуль не варта.

— Ці можа хрышчэнне дарослага чалавека быць проста данінай модзе? У 90-я гады па гэтай прычыне хрысціліся вельмі многія...

— Насамрэч, у 90-я людзі сапраўды адчувалі духоўную смагу. І разам з паслядоўнікамі моды вельмі шмат было тых, хто падыходзіў да таінства хрышчэння глыбока і асэнсавана. Я размаўляў са святарамі больш старэйшымі, якія служылі ў тыя часы, і яны казалі, што пасля сямі дзесяцігоддзяў ганенняў на царкву, калі людзі масава накіраваліся ў храм, вядома, святары з радасцю прымалі гэтых людзей і здзяйснялі хрышчэнне. Тады яшчэ не існавала той практыкі падрыхтоўкі да таінства хрышчэння, якая ёсць цяпер. У апошнія дзесяцігоддзі царква прыкладае шмат намаганняў, каб не проста здзяйсняць хрышчэнне, але каб гэта быў усвядомлены крок для кожнага. Каб людзі заставаліся ва ўлонні Царквы і працягвалі жыць у Хрысце.

— Ці можа святар адмовіць у хрышчэнні? І ў якіх выпадках?

— Гэта магчыма, калі чалавек сам не хоча прымаць хрышчэнне. Здараецца, бацькі, муж (жонка), іншыя блізкія людзі вельмі просяць за чалавека, але сам ён веры не мае. Ён кажа падчас размовы са святаром: «Я гатовы хрысціцца для маці, але сам не надта веру і не абяцаю, што буду хадзіць у храм». У такіх выпадках, на думку некаторых духоўнікаў, спяшацца не трэба. Можа быць, лепш даць чалавеку час, каб ён мог свядома прыйсці да Бога — сам, без ціску звонку. А вось пераход з адной веры ў другую не можа быць прычынай адмовы ў хрышчэнні. Такія прыклады — гэта глыбокі пераварот у жыцці чалавека. Напрыклад, у нашай царкве ёсць вернік з Кітая. Ён прыехаў вучыцца ў Мінск, пазнаёміўся з праваслаўем і прасякнуўся праваслаўнай верай. Нядаўна ён прыняў хрышчэнне, цяпер вывучае багаслоўе.

— Давайце падвядзём вынік: як дарасламу, прыняўшы рашэнне хрысціцца, падрыхтавацца да гэтага таінства?

— У аснове заўсёды павінна быць усвядомленасць вашага рашэння. Неабходна наведаць гутаркі са святаром і схадзіць да перадхрышчальнай споведзі. Зразумела, абавязкова бываць у царкве на набажэнствах і маліцца самастойна. Вельмі важна, рыхтуючыся прыняць хрышчэнне, надаць увагу чытанню духоўнай літаратуры: гэта могуць быць Евангелле з каментарыямі айцоў Царквы, кнігі па асновах праваслаўнай веры. І калі ўзнікне адчуванне ўнутранай гатоўнасці — значыць, прыйшоў час прыняць таінства хрышчэння.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Службовы раман Станіслава Вількіна

ТОЛЬКІ РАЗ БЫВАЕ Ў ЖЫЦЦІ СУСТРЭЧА

Некалькі гадоў таму напярэдадні юбілею я брала ў акцёра Станіслава Вількіна інтэрв'ю, у якім ён казаў:

— 60 гадоў — быццам бы самавіты ўзрост. Але я яго не адчуваю. Мне яшчэ шмат чаго хочацца. Напрыклад, паставіць спектакль пра каханне. Напэўна, пра каханне ўжо ўсё сказана. Ды гэта вечная тэма, і кожны, дакранаючыся да яе, адкрывае нешта новае.

Станіславу Уладзіслававічу было што сказаць пра каханне. Ён не толькі іграў яго на сцэне і ў кіно, але і зведаў у жыцці.

* * *

Жылі два чалавекі. Станіслаў Вількін стаяў каля вытокаў заснавання Тэатра-студыі кінаакцёра. Юлія Гольдзенава прыйшла сюды ў 1993-м маладзенькай дзяўчынай. Па ўласным прызнанні ўсяму вучылася на хаду, слухаючы старэйшых калег, унікаючы ў тонкасці і асаблівасці прафесіі касцюмера. З галавой акунулася ў тэатральны свет, палюбіла яго і спяшалася на працу як на свята. Мыла, прасавала, прыводзіла ў парадак гарнітуры акцёраў, дапамагала апранацца перад спектаклем і пераапранацца па ходзе дзеяння.

Дзевяць гадоў яны працавалі побач і былі проста калегамі. Станіслаў Вількін быў жанаты, у яго раслі двое сыноў — Уладзіслаў і Чэслаў. Юля таксама была несвабодная. У кожнага — свая гісторыя, свой лёс. Дзве паралельныя дарогі.

Але нейкі нябачны рэжысёр, відаць, рыхтаваў кожнаму з іх неспадзяванку, задумаўшы злучыць. Завяршыўся Юлін раман, у сям'і Станіслава справа ішла да разводу...

— Пачаткам нашай гісторыі я лічу дзень нараджэння Станіслава, — расказвае Юля. — 7 кастрычніка 2002 года яму спаўнялася 45 гадоў. Мы з калегамі купілі ў падарунак цацку — ускудлачанага Нафаню з поглядам, падобным на погляд самога Стаса. Адзначалі гэтую падзею ў тэатры, у сваім коле. І вось тады, мне здаецца, паміж намі і ясным унутраным светам. Мне было з ім лёгка, проста і цікава. Вельмі хутка я зразумела, што закахалася.

Прайшло некалькі гадоў, перш чым яны вырашылі жыць разам. І яшчэ некалькі, перш чым афіцыйна аформілі шлюб.

— Вядома, нашы «шуры-муры» не былі тайнай для калег, — працягвае мая суразмоўніца. — Але ў той час у тэатры працякала яшчэ некалькі раманаў. Так што не толькі мы са Стасам давалі глебу для плётак. Мне здаецца, нашы адносіны ні ў кога не выклікалі нейкіх нядобрых рэакцый. Хутчэй наадварот. Памятаю, у самым пачатку ў мяне са Стасам адбылася спрэчка. Пра гэта даведаўся акцёр Пётр Юрчанкаў-старэйшы. Прыйшоў да мяне, узяў за руку, павёў у грымёрку да Стаса і запатрабаваў: «Мірыцеся». Мы паміры лі ся і заўсёды былі Пятру Пятровічу бясконца ўдзячныя. Па-мойму, усе толькі парадаваліся за нас, калі мы абвясцілі, што жэнімся.

Станіслаў Вількін быў выдатным настаўнікам не толькі для блізкіх. Работу ў тэатры сумяшчаў з выкладаннем акцёрскага майстэрства ў мінскай СШ № 27. Дзясяткі яго вучняў сёння паспяхова працуюць у тэатрах Беларусі і за яе межамі. Сярод яго выхаванцаў і сын Чэслаў, якога рыхтаваў да паступлення ў Акадэмію мастацтваў. Цяпер Чэслаў Вількін — у штаце Тэатра-студыі кінаакцёра, рыхтуецца да спектакляў у грымёрцы свайго бацькі. Яраслаў таксама займаўся ў татыў школьнай студыі і таксама марыць аб сцэне.

— Муж ганарыўся трыма Славамі, — падкрэслівае Юля. — Шчаслівы быў дачакацца ўнука: разам з Яраславам ездзіў знаёміцца з малым, сынам Уладзіслава. Муж прысутнічаў на ўсіх спаборніцтвах Ярошы па ўшу, у тым ліку на міжнародных турнірах. Так шчыра цешыўся кожным (а іх ужо больш за 50!) заваяваным сынам медалём.



АПУСЦЕЛА БЕЗ ЦЯБЕ ЗЯМЛЯ

— Муж не любіў хадзіць па ўрачах, — кажа Юля. — Яраслаў часта дзівіўся: «Наш тата ніколі не хварэе». А тут Стас вярнуўся пасля антрэпрызнага спектакля з Магілёва, і яму стала дрэнна: прыхапіла сэрца. Выклікала «хуткую». Кардыяграму медыкі перадалі ў паліклініку. Тэрапеўт выпісаў накіраванне на аналізы. Муж здаў кроў. І аказалася, што ў яго анкалогія.

Вядома, Станіслаў Вількін змагаўся за жыццё, прытрымліваўся ўказанняў спецыялістаў. Юля шукала аўтарытэтных урачоў, кансультавалася з імі, навучылася рабіць уколы. У перыяд рэмісіі ў мужа з'ездзілі на экскурсію ў Польшчу. Станіслаў Вількін паспеў паставіць у школе навагодні спектакль-казку «Чароўнае люстэрка». Яны спадзяваліся...

— Але аднойчы Стас паклікаў на кухню сына і пачаў гаварыць з ім, — успамінае Юля, — аб тым, як мужчына павінен паводзіць сябе ў жыцці, што шанаваць і чаго пазбягаць, як ставіцца да людзей — родных і чужых. Гэта гучала як пажаданне. Мне падалося: ён развітваецца, рыхтуецца да свайго сыходу.

Станіслаў Вількін трымаўся стаічна. Яго сябар, акцёр Анатоль Гур'еў, тэлефанаваў увесь час, гатовы быў прыйсці па першым поклічы. Але Станіслаў не дазваляў, не хацеў, каб сябар і калегі бачылі, як ён слабее.

Апошнія 10 дзён правёў у хоспісе — ужо не мог абыходзіцца без абязбольваючых, без прафесійнай дапамогі. Юля наведвала яго кожны дзень.

— У адну з нашых сустрэч Стас з вялікай цяжкасцю падцягнуўся, абапёрся аб ложак, устаў на ногі і спытаў мяне: «Ну я ж герой?» — расказвае Юля. — Мне здаецца, ён яшчэ спадзяваўся вярнуцца дадому. Апошнімі яго словамі было прызнанне: «Я цябе кахаю».

У красавіку 2020 года Станіслава Вількіна не стала. Першы год пасля сыходу мужа Юля проста вар'яцела. Ратавалі работа, людзі і Яраслаў, вельмі падобны да бацькі...

«Я ні пра што ў жыцці не шкадую: не бачу ў гэтым сэнсу, — гэта словы Станіслава Вількіна з таго перад'юбілейнага інтэрв'ю. — Не крывячы душой, магу сказаць, што шчасцем не абдзелены. Побач каханая жонка, малодшы сын Яраслаў часам разоў дзесяць на працягу дня паўторыць, што любіць мяне. Няўжо гэтага мала?»

Сёння кожная рэч, звязаная з мужам, мае для Юлі асаблівую каштоўнасць. Як той самы Нафаня, сведка нараджэння іх кахання.

Адзіны ліст, дасланы ёй Станіславам яшчэ да жаніцьбы, падчас месячнага расстання. Пасаджаная мужам на клумбе каля дома ялінка. Скрыначка з завушніцамі — за гады сумеснага жыцця муж падарыў Юлі шмат упрыгожванняў. На руцэ ў Юлі сёння гадзіннік, прэзент мужа на дзень нараджэння, а на безыменным пальцы па-ранейшаму — заручальны пярсцёнак. Ёй вельмі не хапае падтрымкі Станіслава, яго пляча. Але Юля Вількіна спраўляецца. Усё ж яна — жонка свайго мужа.

Вольга ПАКЛОНСКАЯ.
Фота з сямейнага архіва ВІЛЬКІНЫХ.

Шлюб Станіслаў і Юлія заключылі ў красавіку 2006-га. А ў красавіку 2007-га ў іх нарадзіўся Яраслаў.

— Я вельмі хацела дзіця, — прызнаецца Юля. — Даведаўшыся аб цяжарнасці, скакала ад радасці. А вось Стас гэтую навіну сустрэў без захаплення. Яму было 49 гадоў. Мне здаецца, ён спалохаўся гэтай вялікай новай адказнасці. Хадзіў пануры, нейкі задуменны. Але праз час пачаў асвойвацца з думкай аб сваёй новай ролі і неяк сказаў: «Алег Табакоў старэйшы за мяне і нічога, не баіцца бацькоўства. А я чым горшы?»

Горшы?! Ды ён стаў выдатным бацькам! Выгульваў нашага малога ў калясцы, купаў, забаўляўся з ім. Калі я выйшла з дэкрэтнага, Стас больш за мяне прысвячаў часу Яраславу. Я разам з «ТрыТфармаТ»-тэатрам з'язджала на гастролі ў Францыю, Італію, Фінляндыю, а муж заставаўся з сынам дома.

Спачатку сужэнцы жылі разам з Юлінай цёткай, потым атрымалі арэнднае жыллё. Гэтыя гады ва ўласным гняздзечку Юлія ўспамінае як вельмі шчаслівыя.

— Я вырасла без бацькі, — дзеліцца яна. — Стас у нейкай меры стаў для мяне не толькі мужам, але і настаўнікам, старэйшым сябрам, аўтарытэтам ва ўсіх адносінах. Усё ўмеў рабіць. Цалкам уладкаваў нашу кватэру. З задавальненнем варыў супы. Такога смачнага баршчу, як у яго, не ела нідзе. У мужа былі свае фірменныя стравы. І мяне навучыў гатаваць.

Ніколі не рабіў нікому зла, свята прытрымліваўся правіла: да іншых стаўся так, як хацеў бы, каб ставіліся да цябе. Гэтага дэвізу Станіслаў Уладзіслававіч прытрымліваўся ва ўсім. Побач з мужам Юля расла як асоба, станавілася мацнейшай, устойлівай, мудрай. Вучылася таму, як не падаць духам з-за няўдач, знаходзіць выйсце з цяжкіх сітуацый, не адчайвацца.

У вольны час Станіслаў Вількін любіў з сям'ёй і сябрамі ладзіць на прыродзе шашлыкі. Улетку яны ўтрох імкнуліся адпачыць у Балгарыі. Мора, сонца і яны — загарэлыя, вясёлыя, шчаслівыя. Проста цуд!

З чаго складаецца каханне? З сумесных радасцяў і смуткаў, з клопату аб дзецях, з позніх чаяванняў і размоў на кухні, са спрэчак і рэўнасці, з падарункаў з нагоды і без, са смеху і слёз, з пацалункаў і абдымкаў — з усяго, што лічыш паўсядзённасцю і нават часам не заўважаеш, калі яно ў цябе ёсць, і з-за чаго смяротна сумуеш, калі яно знікае. Юля верыла: яны будуць жыць доўга і шчасліва, выгадуюць сына і памруць у адзін дзень. Але ўсё склалася інакш.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

З канверта

СТРЫЖКА ЗА СОРАК КАПЕЕК

Я, Галка і Воўка жылі на адным завулку і ў школу хадзілі разам — паўтара кіламетры ўздоўж чыгункі або па шпалах. Хоць нас папярэджвалі: «Па чыгунке хадзіць нельга». Мамы давалі нам па дзесяць капеек на сняданак. За гэтыя грошы ў буфеце можна было купіць гарбату і булачку або піражок. Часам мы куплялі брыкецік фруктовай гарбаты. Гэта было так цудоўна — ісці са школы і грызці фруктовы чай!

Цётка Ніна, Галкіна мама, настаўляла мяне: «Валя, ты ж выдатніца! Пазаймайся з Галяй, падцягні яе». І я бегла да Галі «займацца». Мы марылі, фантазіравалі... і рабілі выгляд, што вучым урокі. Наша сталенне пачалося са з'яўлення ў аднакласніц модных стрыжак. А магчыма, гэта мы спачатку пасталелі, а потым пачалі мяняць прычоскі.

У кінатэатры круцілі фільм «Брыльянтавая рука». На афішы значылася: «Дзеці да шаснаццаці гадоў не дапускаюцца». Гэта моцна інтрыгавала. Казалі, што фільм — проста бомба! Трапіць на сеанс для нас стала мэтай. Прыкінуцца шаснаццацігадовымі было нескладана, але дзе ўзяць грошы на квіткі? Вырашылі эканоміць на сняданках...

Мы тапталіся каля кінатэатра і адначасова паглядалі ў вокны суседняй цырульні. Назіралі за працэсам. Ва ўсіх аднакласніц былі касічкі, і мы прыкідвалі, як бы глядзеліся з прычоскамі?

Першымі пастрыгліся пад «Гаўрош» Людка і Марына. Яны горда зайшлі ў клас, і ўсім дзяўчынкам тут жа захацелася такую стрыжку. Гэта было так стыльна ў параўнанні з надакучыўшымі касічкамі! Прычоску Людкі цётка Ніна ўхваліла і дала Галі сорак капеек на стрыжку: «Трэба і твае мышыныя хвосцікі абрэзаць, а то надакучыла падзяляць тры валаскі ў два рады».

— Пойдзем у кіно, — заскакала я ад радасці, як толькі ўбачыла ў сяброўкі грошы. — Сарака капеек хопіць на два квіткі. А потым я цябе сама падстрыгу. Бачыла ж, як гэта робяць у цырульні!

Ідэя была геніяльнай, і Галка пагадзілася.

Пасля ўрокаў мы пабеглі ў кіно. Класны фільм! Па дарозе дадому мы пераймалі размову кантрабандыстаў: «Чорт пабяры! Чорт пабяры!» і рагаталі як вар'яты. Падстрыгчы Галку трэба было да вяртання цёткі Ніны з працы. Мы неадкладна прыступілі да працэсу:

загорнутая ў прасціну сяброўка сядзела на крэсле пасярод пакоя, а я, як сапраўдны майстар, чаравала вакол яе галавы з вялікімі нажніцамі.

Спачатку дзве касічкі бязгучна ляглі на падлогу разам з бантамі. Потым частку валасоў я зачасала на твар і абрэзала чубок, атрымалася наўскасяк і зубцамі. Затое вызначыліся контуры прычоскі. Заставалася стрыжцы надаць форму «Гаўрош». Галка сядзела смірна, а я, высунуўшы кончык языка ад напружання, старанна стрыгла... Гэта аказалася няпроста. Ці то нажніцы былі не тыя, ці то расчоска, або рукі ў мяне раслі не з таго месца, толькі пасмы ніяк не зразаліся роўна. Але я зразумела прынцып — трэба зразаць паступова, каб пераход адной даўжыні ў іншую быў плаўны.

Але валасы, нібы жывыя, выслізгвалі з нажніц, плаўнага пераходу не атрымлівалася. На шчасце, валасоў было яшчэ шмат, а значыць, шанц усё скарэкціраваць заставаўся. І тут у госці зайшоў Воўка. Убачыўшы Галку, ён прама з парога закрычаў: «Галя! Што яна з цябе зрабіла! «Лесвічку» выстрыгла! Давай яе таксама падстрыжэм!»

Увогуле, ёсць такая стрыжка — «лесвічка». Чаму ж так жахнулася тады Галка? Можа, яе напалохала не слова «лесвічка», а Воўкіны вочы, што вылезлі з арбіт? На мой погляд, на галаве ў сяброўкі нічога падобнага на лесвічку і блізка не было. Галка як уджаленая кінулася да люстэрка. На яе твары адбіўся шчыры жах, як быццам яна ўбачыла галаву Мядузы Гаргоны.

«Давай яе падстрыжэм! — азвярэла роў Воўка. — Трымай яе!» І яны кінуліся мяне лавіць. Я насіла доўгія косы і пазбаўляцца ад іх не збіралася нават нягледзячы на моду. З нажніцамі ў руках я выскачыла з дому і басанож панеслася па вуліцы. Як я ад іх тады ўцякла? Галі ад маці потым уляцела.

На наступны дзень у школу я ішла адна з пачуццём віны, а Воўка ішоў за мной і здалёк з пажадлівасцю пазіраў на мае косы. Відаць, яму ўсё яшчэ хацелася іх абрэзаць. Сяброўка на ўрокі так і не з'явілася. Больш за ўсё на свеце я цяпер баялася сустрэцца з цёткай Нінай.

Галка прыйшла ў школу праз дзень, яе пастрыглі «пад хлопчыка». Са мной яна не размаўляла. Я таксама вінавата маўчала. А па дарозе дадому сустрэла яе маму і пачырванела да каранёў валасоў. Цётка Ніна, зірнуўшы на мой пакутлівы выраз твару, злітавалася:

— Валя, я ўжо не злуюся, валасы адрастуць. Вядома, цырульнік быў у жаху, калі Галя села ў крэсла... Калі вы так хацелі ў кіно, трэба было проста папрасіць у мяне грошай... Ну, добра. Не хвалюйся, прыходзь да нас.

Мы і з Галкай памірыліся. Але з таго часу я больш нікога не стрыгла.

Валянціна БЫСТРЫМОВІЧ.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

З ЗЯЛЁНЫХ ПАМІДОРАЎ

Квашаныя

Памідорчыкі атрымліваюцца вельмі смачнымі, востранькімі і незвычайна духмянымі, гатовыя да ўжывання ўжо праз трое сутак.

Спатрэбіцца: *памідоры зялёныя (можна і бурыя) — 1,5 кг; морква — 1 шт.; перац балгарскі салодкі — 1 шт.; перац чылі — 1 шт.; часнок — 1 галоўка; зяленіва кропу і пятрушкі — па 0,5 пучка; ліст лаўровы — 3-4 шт.; вада — 1,5 літра; соль буйная — 3 ст. л.; цукар — 1 ст. л.*

Зялёныя памідоры (лепш сярэдняга памеру) вымыць, зрабіць крыжападобныя надрэзы зверху, але не да канца. Здрабніць моркву, перац, часнок і перац чылі ў блэндары. Дадаць да гэтай сумесі здробненае зяленіва. Старанна ўсё перамяшаць. Падрыхтаваны масай начыніць разрэзы памідораў і змясціць іх у глыбокую каструлю пластамі. Зверху дадаць лаўровы ліст. Прыгатаваць расол: у ваду дадаць соль і цукар, давесці ўсё да кіпення. Даць расолу крыху астыць (хвіліны 4-5) і заліць ім памідоры. Зверху памідораў размясціць невялікі груз і пакінуць іх пры пакаёвай тэмпературы на 3-4 сутак. Пасля таго квашаныя зялёныя памідоры можна падаваць на стол.

Захоўваць памідоры ў халадзільніку.

Па-карэйску

Спатрэбіцца: *зялёныя памідоры — 500 г; морква — 0,5 шт.; перац салодкі балгарскі (лепш чырвоны) — 0,5-1 шт.; часнок — 3 зубчыкі; перац чылі — 1 шт.; соль — 1 ч. л.; цукар — 1,5 ст. л.; воцат 9 % — 1 ч. л.; каляндра ў зернетках — 0,5 ч. л.; алей — 2,5 ст. л.*

Зялёныя памідоры нарэзаць тонкімі паўкругамі, пасыпаць соллю, перамяшаць і пакінуць на гадзіну. Потым памідоры адкінуць на друшляк і крыху адціснуць. Дадаць моркву, надзёртую на тарцы для карэйскай морквы, нарэзаны тонкай саломкай балгарскі перац і прапушчаны праз прэс часнок. Таксама дадаць цукар і ўліць воцат. У патэльні разагрэць алей, дадаць у яго свежамолатае ці расціснутае зерне каляндры і нарэзаны кольцамі перац чылі. Памешваючы, абсмажыць каляндру і перац на працягу хвіліны. Выліць гарачы алей з перцам і каляндрай зверху гародніны і часнаку. Адразу ж усё перамяшаць. Гародніну ўтрамбаваць, накрыць і пакінуць у халадзільніку на 7-8 гадзін.

Ікра на зіму

Спатрэбіцца: *зялёныя памідоры — 1 кг; цыбуля рэпчатая — 0,5 кг; морква — 0,5 кг; часнок — 10-12 зубкоў; цукар — 4 ст. л.; таматная паста — 2 ст. л.; соль — 1 ст. л.; папрыка молатая — 1 ч. л.; алей — 100 мл; перац чорны молаты — 1,5 ч. л.; воцат 9 % — 2 ст. л.*

Зялёныя памідоры разрэзаць на 2-4 часткі, выдаліць пладаножкі. Пракруціць памідоры праз мясарубку да кашы. На дно падыходзячай каструлі наліць алей, затым вылажыць перакручаныя памідоры. Каструлю з памідорамі паставіць на агонь і давесці да кіпення, затым паменшыць агонь, накрыць каструлю вечкам і варыць 15 хвілін, часам памешваючы. Потым дадаць перакручаныя на мясарубцы моркву і цыбулю. Змяшаць і варыць яшчэ 10 хвілін на невялікім агні, часам памешваючы. Затым дадаць цукар, соль, папрыку, чорны перац, здробнены часнок і таматную пасту, змяшаць і варыць ікру з зялёных памідораў яшчэ 5 хвілін. Затым, па жаданні, агароднінную масу можна дадаткова ўзбіць блэндарам, дамагаючыся больш аднастайнай кансістэнцыі. Варыць яшчэ 5 хвілін, пасля дадаць воцат і змяшаць. Гарачую ікру адразу ж пералажыць у стэрыльныя слоікі, закруціць вечкамі і ахінуць да поўнага астывання. Каштаваць ікру можна адразу, як толькі тая астыне. Захоўваюцца слоікі з ікрой ва ўмовах гарадской кватэры.

ВАРЭННЕ «СЛІВЫ Ў ШАКАЛАДЗЕ»

Варэнне «Слівы ў шакаладзе» цяпер вельмі моднае, калі можна так выказацца адносна кулінарнага рэцэпта. Асаблівасць яго заключаецца ў дадаванні масла і какавы, што надае звычайнаму варэнню са слівы эфект шакаладнай пасты.

Спатрэбіцца: *слівы — 2 кг; цукар — 1 кг; масла — 150 г; натуральны какава-парашок — 80 г.*

Слівы вымыць, выдаліць костачкі. Прапусціць слівы праз мясарубку, каб атрымалася пюрэ. Усыпаць цукар, змяшаць і паставіць варыць. Калі варэнне закіпіць, зняць з яго пену і варыць на сярэднім агні 35-45 хвілін, увесь час памешваючы, каб не прыгарэла. Затым дадаць у варэнне масла. Усыпаць какаву, змяшаць, каб какава растварылася, і варыць яшчэ 15 хвілін, не забываючы памешваць.

Варэнне адразу разліць па стэрылізаваных слоіках, астудзіць і прыбраць для захоўвання ў халадзільнік.

ВАРТА ВЕДАЦЬ

ЦІ МОЖНА ПАКІДАЦЬ ТЭЛЕВІЗАР ЗІМОЙ НА ДАЧЫ

Пакідаючы дачу на зімовы сезон, памятайце: бытавая тэхніка, якая там застаецца, можа стаць ахвярай нізкіх тэмператур.

Каб быць упэўненымі ў захаванасці тэхнікі, трэба зважаць на тэмпературу захоўвання, паказаную вытворцам электрапрыбораў.

Напрыклад, захоўванне тэлевізара з вадкакрышталічным дысплэем пры мінусавай тэмпературы для яго можа стаць фатальным. Вялікая частка ВК-дысплэяў не разлічана на тое, каб знаходзіцца пры мінусавай тэмпературы, асабліва пры моцных маразах.

Некаторыя мадэлі такіх тэлевізараў можна пакідаць пры тэмпературы да -15—20 °С, але не больш. Але нават пры такой тэмпературы ўсю зіму захоўвацца тэлевізар не зможа. Са строю можа выйсці матрыца.

Старыя тэлевізары-«скрынкі» лічацца самымі надзейнымі ў плане захоўвання пры нізкіх тэмпературах.

Ідэальным варыянтам захоўвання тэлевізара на дачы будзе ўпакоўка, у якой ён прадаваўся. Яна засцеражэ тэхніку ад пылу і вільгаці, а змешчаны ўсярэдзіне пенапласт не дасць прабрацца холаду.

Трэба дастаць батарэйкі з пульта (яны могуць працячы) і аддзяліць ад апарата ўсе кабелі.

Калі ж упакоўка не захавалася, можна ахінуць тэлевізар шчыльным пакрывалам або непатрэбнай коўдрай. Гэта таксама дазволіць засцерагчы прыбор ад пылу і дробных насякомых. А вось плёнкай накрываць не варта — пад ёй можа пачаць кандэнсавацца вільгаць, небяспечная для тэхнікі.

Калі раптам вырашыце прыехаць на дачу ўзімку, не спяшайцеся ўключаць тэлевізар. Спачатку добра абагрэйце памяшканне, і толькі пасля таго як тэлевізар прабудзе ў цёплай хаце 4-5 гадзін, яго можна смела ўключаць. Неабходна, каб тэхніка не толькі прагрэлася да пакаёвай тэмпературы, але і высахла ад кандэнсату, які ўтварыўся на ёй ці ў ёй. Памятайце, тэхніка вельмі адчувальная да рэзкіх перападаў тэмператур.

ТВАЕ ДЗЕЦІ, ТАБЕ І ГЛЯДЗЕЦІ (БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ПРЫМАЎКА).

Вішнёвыя костачкі замест вугалю

Што чакае Польшчу?

Каля 90 працэнтаў жыхароў Польшчы, якія абагравaюць свае дамы вугалем, не маюць яго дастатковых запасаў на надыходзячы ацяпляльны сезон. Такая шакавальная тэндэнцыя вынікае з даных апытання, праведзенага польскім Цэнтрам вывучэння грамадскай думкі (CBOS), паведаміла PIA «Навіны». 35 працэнтаў рэспандэнтаў адзначылі, што маюць толькі невялікія запасы вугалю на ацяпляльны сезон, а 40 працэнтаў і ўвогуле заявілі аб іх поўнай адсутнасці. 15 працэнтаў апытаных паведамілі, што падрыхтавалі вялікія запасы, аднак іх усё роўна не хопіць на ўвесь ацяпляльны сезон. І толькі 9 працэнтаў лічаць, што ў іх дастаткова вугалю на ўвесь сезон. Акрамя таго, 79 працэнтаў рэспандэнтаў апасаюцца, што падчас ацяпляльнага сезона сутыкнуцца з праблемамі. У CBOS растлумачылі, што гэтыя небеспадстаўныя трывогі датычацца як адсутнасці вугалю на рынку, так і вельмі высокіх цэн на яго. Афіцыйная Варшава, якая занятая выкананнем задач сваіх заакіянскіх «куратараў», абмяжоўваецца цьмянымі абяцаннямі і парадамі наконт жорсткай эканоміі. Такая пазіцыя яшчэ больш палохае людзей. Што ж чакае Польшчу?

ЖАХЛІВАЯ СІТУАЦЫЯ

Надыходзячая зіма можа аказацца самай суровай для Польшчы за многія дзесяцігоддзі з прычыны нарастаючага энергетычнага крызісу, эканамічныя і сацыяльныя наступствы якога будуць адчувацца яшчэ доўгі час. Аб гэтым заявілі ў Польскай гандлёвай палаце вуглепрадаўцоў (IGSPW), паведаміў інфармацыйны партал SlaskiBiznes.pl. У IGSPW адзначылі, што Польшча сутыкаецца з вялікай рызыкай недахопу вугалю ўзімку. Паводле ацэнак арганізацыі, да канца бягучага года яго можа не хапіць прыкладна 4-6 мільёнаў тон, з якіх каля 2,5 млн т прыпадае на ацяпляльныя патрэбы. «Нягледзячы на шматлікія заявы аб павелічэнні здабычы вугалю ў Польшчы, яна ўпала», — піша партал, спасылаючыся на даныя Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення краіны.

Акрамя таго, узровень запасаў у адвалах рэзка зменшыўся. У ліпені мінулага года там знаходзілася больш чым 4,9 мільёна тон вугалю, а сёлета на канец ліпеня — каля 1,2 млн т. Паводле звестак IGSPW, сітуацыя на польскіх вугальных складах цяпер «жахлівая». Вуглегандлёвыя кампаніі практычна цалкам адрэзаныя ад айчыннай сыравіны, паколькі змянілася мадэль збыту, а імпартны вугаль неймаверна дарагі. «Прычынай такой сітуацыі з'яўляецца ўведзенае без падрыхтоўкі эмбарга на расійскі вугаль, якое прынесла больш шкоды, чым карысці», — падкрэслілі ў IGSPW. Таксама ў арганізацыі дадалі, што эмбарга, уплыў якога істотна не адбіўся на Расіі, вельмі моцна ўдарыла па рынку вугалю ў Польшчы, узняўшы цэны на сыравіну да «астранамічных значэнняў» і паставіўшы пад пагрозу закрыцця сотні польскіх прадпрыемстваў.

Нягледзячы на недахоп вугалю, у першым паўгоддзі гэтага года Польшча экспартавала каля мільёна тон гэтай сыравіны і па-ранейшаму працягвае пастаўкі за мяжу. Прэзідэнт Польскай горнапрамысловай палаты Януш Альшоўскі лічыць, што ўжо ў найбліжэйшы час краіна можа сутыкнуцца з дэфіцытам электраэнергіі, паколькі 70 працэнтаў энергіі ў Польшчы вырабляецца з вугалю. «Мы дапусцілі памылку, пачаўшы адыходзіць ад вугалю і абмежаваўшы як інвестыцыі ў здабычу, так і вытворчыя магутнасці, перш чым удалося гарантаваць энергетычную бяспеку насельніцтва», — канстатаваў ён. Пры гэтым эксперты папярэджваюць, што недахоп вугалю, які пагражае мільёнам польскіх хатніх гаспадарак, гэта толькі верхавіна айсберга будучага энергетычнага крызісу.

ЗАЛАТОЕ ПАЛІВА

У Польшчы на многіх складах скончыўся каменны вугаль, а калі ён і ёсць у наяўнасці, яго кошт перавышае 4 тысячы злотых за тону, паведаміў партал Fakt. Галоўная прычына — увядзенне польскімі ўладамі эмбарга на расійскі вугаль. У выніку адбываецца шалёны рост цэн. Калі ў маі тона вугалю каштавала каля 2 тысяч злотых, то ў чэрвені — ужо 3 тысячы. Партал Fakt згадаў словы афіцыйнага прадстаўніка ўрада Пятра Мюлера ад 8 чэрвеня, які заклікаў грамадзян на фоне росту цэн пачакаць і пачаць закупляцца бліжэй да восені. Ён паабяцаў, што ўрад знізіць кошт паліва.

«Танны вугаль — па 996 злотых за тону — планавалі забяспечыць на заканадаўчым узроўні. Са жніўня любая хатняя гаспадарка, якая мае вугальную печ, магла набыць паліва па такім кошце. На кожную хатнюю гаспадарку меркавалася размеркаваць тры тоны вугалю. Але законапраект лопнуў, як мыльная бурбалка: ураду не ўдалося пераканаць склады прадаваць паліва па такой цане. Цяпер палякі могуць падаваць заявы на субсідыі і пры фінансавай падтрымцы дзяржавы купляць вугаль. Дапамога аднаразовая і складае тры тысячы злотых», — адзначаецца ў артыкуле Fakt.

Як распавяла супрацоўніца паліўнага склада ў Белагардзе (Заходнепаморскае ваяводства) Патрыцыя Даманьская, каб набыць вугаль па такім кошце, трэба спачатку яго знайсці. Склады стаяць пустыя. Там няма запатрабаванага спажыўцамі каменнага вугалю. Пастаўкі з польскіх шахтаў практычна адсутнічаюць. Патрыцыя Даманьская адзначыла: людзі вельмі занепакоеныя тым, што адбываецца. Супрацоўнікі склада кожны дзень адказваюць на дзясяткі тэлефонных званкоў з пытаннямі, ці ёсць тавар у наяўнасці і колькі ён каштуе. «Цяпер у мяне ёсць «эка-гарошак» па цане 3790 злотых і брыкеты за 3150 злотых. Яшчэ нядаўна такі ж брыкет каштаваў у нас крыху больш за 1,8 тыс. злотых за тону, але ўжо апошняя дастаўка была на тысячу злотых даражэйшая», — заўважыла Патрыцыя Даманьская.

Не толькі ў Заходнепаморскім ваяводстве не хапае вугалю. Яго няма і ў Вроцлаве. Журналісты патэлефанавалі на склады і ўдакладнілі, які тэрмін чакання дастаўкі паліва. Супрацоўнікі складоў у Вроцлаве паведамілі, што атрымліваюць вугаль з затрымкай у паўтара месяца і не могуць сфарміраваць чэргі з кліентаў. У Новым Сончы работнік склада заявіў, што тэрміны паставак вугалю невядомыя.

ЖУДАСНЫЯ ЎМОВЫ

Пры гэтым, як даведаліся журналісты Fakt, ёсць месцы, дзе можна купіць вугаль у розным асартыменце. Але цэны ўражваюць: у Легніцы кошт набліжаецца да 4 тысяч злотых, у Новым Сончы — 4,4 тысячы злотых за тону. Гэта азначае, што дзяржаўнай дапамогі можа не хапіць нават на тону паліва. Пры гэтым для ацяплення дома патрабуецца 3-5 тон вугалю ў сезон. Журналісты Fakt задаліся пытаннем, што ж цяпер робіць урад, каб дапамагчы сваім грамадзянам. Адказ быў атрыманы ў выступленні міністра клімату і навакольнага асяроддзя Польшчы Ганны Масквы, якая паралела купляць вугаль у растэрміноўку і нагадала: ніхто не абяцаў, што ён будзе бясплатны. У эфіры радыёстанцыі Zet яна распавяла, што лічыць тэмпературу ў 17 градусаў у доме карыснай для здароўя.

Экс-прэм'ер Польшчы, лідар партыі «Грамадзянская платформа» Дональд Туск раскрытыкаваў міністра клімату і навакольнага асяроддзя Ганну Маскву за жудасныя ўмовы жыцця палякаў і энергакрызіс, з-за якога грамадзяне не ведаюць, як перажыць зіму. Аб гэтым ён напісаў у адной з сацыяльных сетак. «У знаёмага ў кватэры 15 градусаў і халодная вада ў кране. Магчыма, гэта пілотная праграма міністра Масквы на асенне-зімовы сезон», — напісаў Туск.

Простыя палякі падтрымалі Туска і падзялiліся сваім вопытам. Некаторыя прама заяўляюць, што не будуць ацяпляць сваё жыллё ў асенне-зімовы перыяд. «У мяне дома таксама 15 градусаў. Мая маці не будзе ацяпляць усю зіму, таму што яе палохаюць рахункі. Яна ўжо прыгатавала коўдры, шапкі і пледы», — напісаў grzegorz rusin.

Другі каментатар з горкай іроніяй паставіўся да таго, што адбываецца. Паводле яго слоў, тыя, хто перажыве халады, змогуць загартаваць свой арганізм. «Тыя, каму ўдасца выжыць, могуць смела рыхтавацца да ўдзелу ў спаборніцтвах па зімовым плаванні ў 2024 годзе. Крыякамера перастане быць нечым асаблівым, а ахаладжэнне цела да тэмпературы, блізкай да 25 градусаў па Цэльсію, неабавязкова пацягне за сабой смерць», — напісаў Zbyszek.

Яшчэ адзін каментатар указаў на відавочную хлусню міністра Масквы, якая сцвярджае, што грамадзяне змогуць прывыкнуць да такіх умоў. «Міністр Масква пахвалілася, што ў яе дома 17 градусаў і да гэтага можна прывыкнуць. Я ніколі ў гэта не паверу. Няўжо яны думаюць, што ў Польшчы жывуць наіўныя людзі?» — абураны Jarek.

ГРОНКІ ГНЕВУ

Жыхары Польшчы могуць выкарыстоўваць для ацяплення дамоў гэтай зімой усё, акрамя шын, заўважыў старшыня польскай кіруючай партыі «Права і справядлівасць» Яраслаў Качыньскі падчас сустрэчы ў Новым Тарге, паведаміў Onet.pl. Міністр дзяржаўных актываў Яцэк Сасін, каментуючы гэтую заяву, адзначыў, што ніхто не закліка паліць у печы смеццем, нягледзячы на беспрэцэдэнтны энергетычны крызіс. Fakt піша, што дамы можна ацяпляць, напрыклад, вішнёвымі костачкамі ці пшаніцай. «Калі вугаль жахліва дарагі, вішнёвыя костачкі можна выкарыстоўваць у якасці альтэрнатыўнай крыніцы энергіі. Хоць іх цеплатворная здольнасць (колькасць цяпла, што выдзяляецца пры згаранні) ніжэйшая, чым у каменнага вугалю, яна вышэйшая, чым у драўніны», — паведаміў выданню спецыяліст па ўстаноўцы і рэканструкцыі печаў Томаш Хмялеўскі.

Таксама для ацяплення падыходзяць розныя віды травы (авёс, пшаніца), а яшчэ зерне кукурузы, пры ўмове, што яны будуць досыць сухімі і прыдатнымі для аўтаматычнай падачы. Аднак збожжа, на думку Хмялеўскага, не варта выкарыстоўваць для ацяплення з этычных меркаванняў. «Пшаніцу таксама можна паліць, але тут узнікае дылема. Гэта ж ежа. У свеце крызіс, многія галадаюць, ці этычнае такое спальванне? Я думаю, што лепш за ўсё выбрасць пшаніцу, пашкоджаную нейкімі хваробамі, з якой і так не атрымалася б хлеба ці іншых прадуктаў», — падкрэслівае эксперт. У выпадку выкарыстання збожжавых найлепшы вынік у плане ацяплення дае авёс. «Ён лёгка згарае, і ад яго застаецца мала попелу — тое, што засталося, можна выкарыстоўваць у якасці ўгнаення», — раіць спецыяліст. Сёння тона пшаніцы каштуе ў Польшчы каля 1,5 тысячы злотых, аўса — 1,1 тыс.

Перспектывы змрочныя. Варшаўскі індэкс WIG20 у жніўні ўпаў на 11 працэнтаў, што з'яўляецца найвышэйшым паніжэннем сярод 92 асноўных сусветных фондавых індыкатараў, якія адсочваюцца Bloomberg. У цэлым сёлета польскія акцыі ўпалі ўжо на 32 працэнты. Цяпер яны таргуюцца з самай нізкай ацэнкай у адносінах да аналагаў за ўсю гісторыю. Абвал узмацніўся з-за падзення акцый камунальных прадпрыемстваў — найбуйнейшая ў краіне электраэнергетычная кампанія PGE SA патаннела амаль на траціну. Нявызначанасць у дачыненні да таго, як дзяржава будзе імкнуцца зменшыць уплыў росту цэн на хатнія гаспадаркі і ключавыя кампаніі, таксама адпужвае інвестараў ад польскага рынку акцый.

Тым часам улады выбіраюць тушыць пажар бензінам. Стала вядома, што Міністэрства нацыянальнай абароны Польшчы за два дні падпісала кантракты на набыццё ўзбраення амаль на 7 мільярдаў злотых (амаль 1,5 мільярда долараў). Пра гэта паведаміла агенцтва PAP. У адным з нядаўніх сацыялагічных даследаванняў вывучалася стаўленне палякаў да прыманых урадам мер па абмежаванні росту цэн на электраэнергію і ацяпленне. Не дзіўна, што большасць людзей (60 працэнтаў рэспандэнтаў) заявіла аб сваім негатыўным стаўленні да бяздзейнасці ўлад у дадзенай сферы. Афіцыйная Варшава занятая палітычнымі гульнямі і не звяртае ўвагі на простых людзей. Між тым палякі ўжо даведзеныя да адчаю — нарастае пратэсная хваля. І халады ў такой сітуацыі з'яўляюцца трыгерам развіцця падзей.

Пётр ДУНЬКО.

Даслоўна

«Беларусы вызвалялі Польшчу, а чым яна адказвае — фэйкамі Белсата, байполамі і байсоламі?»

Памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны, якія захавалі польскую нацыю і дзяржаўнасць, сёння там проста сціраюць з гісторыі. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на патрыятычным форуме «Гэта НАША гісторыя!», прысвечаным Дню народнага адзінства.

«Беларусы ў саюзе з іншымі савецкімі народамі не толькі перамаглі, але і, адкінуўшы ранейшыя крыўды, у 1945-м вызвалілі Польшчу ад фашызму. Звыш 600 тысяч савецкіх воінаў (сярод іх нямала беларусаў) назаўсёды засталося ляжаць у польскай зямлі. І хто там, па той бок Буга, сёння аб гэтым успамінае? Чым нам сёння адказваюць? Карткамі паляка, фэйкамі Белсата, праграмамі Калініоўскага, палітэмігранцкімі цэнтрамі, байполамі, байсоламі і іншымі ідэалагічнымі дыверсіямі. Дадайце да таго, што на тэрыторыі гэтых дзяржаў, і асабліва ва Украіне (знайшлі зручнае месца), сёння фарміруюцца сілавыя падраздзяленні для звяржэння ўлады ў Беларусі і вяртання нас як мінімум да таго 1939 года. Памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны, якія захавалі польскую нацыю і дзяржаўнасць, якія выратавалі Прыбалтыку і цывілізаваную Еўропу ад карычневай чумы, сёння там проста сціраюць з гісторыі ўнукі і праўнукі тых салдат вермахта і германскіх сатэлітаў. Вы паглядзіце на цяперашніх палітыкаў Еўропы і нашых суседзяў: тата і дзядуля служылі ў фашысцкіх войсках. Вось яны сёння рвуцца сюды: ім патрэбны рэванш», — падкрэсліў беларускі лідар.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже

ЗДАНИЯ МАГАЗИНА № 59

***(составные части и принадлежности: сарай, керосинохранилище)* с инв. № 620/С-39849 общей площадью 89,9 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622281711601000094 *(право постоянного пользования)* площадью 0,0863 га по адресу: Минская область, Дзержинский район, Дзержинский с/с, д. Ясютевичи, ул. Центральная, 27Б.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 25 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **2 500,00** бел. руб.
Начальная цена снижена на 50 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

